# *VERITAS №1*

Бюлетэнь БГА “Ветэраны Адраджэньня”

Рэдакцыйная калегія:
*Зьміцер Санько* (галоўны рэдактар), *Зьдзіслаў Сіцька, Сяргей Ёрш, Міхась Чарняўскі* (адказны сакратар)

Укладальнікі нумару:
*Міхась Чарняўскі, Сяргей Ёрш*

тэл. (017) 296-43-15
e-mail max@char.lingvo.minsk.by

## ЗЬМЕСТ

Ад рэдакцыйнай калегіі . . . . . 2
Зварот Аргкамітэта па стварэньні грамадзкага аб’яднаньня “Ветэраны Адраджэньня” . . . . . 3
Статут Беларускага грамадзкага аб’яднаньня “Ветэраны Адраджэньня” . . . . . 4
Кіраўніцтва аб’яднаньня . . . . . 7
Эмблема аб’яднаньня . . . . . 7

ДА ЮБІЛЕЮ ПЕСЬНЯРОЎ
*Янка Купала*. Беларускі сьцяг уваскрос! . . . . . 8
Збалелае сэрца (Зь ліста Якуба Коласа) . . . . . 8

ДАКУМЭНТЫ Й МАТЭРЫЯЛЫ
Зь ліста Браніслава Ржэўскага . . . . . 9
*Мікола Канаш*. Паэт Віталь Губарэвіч . . . . . 10
*Віталь Губарэвіч*. Да Ларысы Геніюш . . . . . 10
Адозьве 50 гадоў . . . . . 11
*Ларыса Геніюш*. “У мяне цяпер столькі жалю і крыўды...” . . . . . 11
*Віктар Шамянкоў*. Як было ў Бабруйску . . . . . 13

ЗЬ МЕМУАРАЎ
*Гражына Ліпіньска*. Пра Вацлава Іваноўскага . . . . . 14
*Аляксандар Амельяновіч*. Радзіма ў сэрцы з маленства . . . . . 16
*Андрэй Вайтовіч*. Згадкі пра вядомых патрыётаў . . . . . 18
*Пятро Шырокаў*. Савецкая Гальгота . . . . . 19
*Тамара Мінкевіч*. Правай рукой, або Пра Яўгена Куліка расказвае ягоная сястра . . . . . 21

IN MEMORIA
Ветэраны Адраджэньня не зыходзяць у нябыт ... (памяці Івана Карповіча) . . . . . 22
Памёр Мікола Рулінскі . . . . . 23

У НАШЫХ СУСЕДЗЯЎ
*Аляксандар Чарніцкі*. Бацька іўрыту — наш зямляк . . . . . 23

АДРАДЖЭНЦЫ
*Уладзімір Конан*. Пра Лявона-рыцара ды Лаўрэнція-аглабельніка . . . . . 26
*Міхась Ткачоў*. З адказаў на пытаньні дэлегатаў зьезду . . . . . 27

АРХІЎ
*Сяргей Ёрш*. “Лепш я загіну адзін, але іншых ня выдам” . . . . . 28
*Мікола Ракевіч*. Патрыёт Беларусі . . . . . 29
*Андрэй Краўцоў*. Змагаўся за Радзіму . . . . . 30
*Іван Радзевіч*. Антон Неканда-Трэпка . . . . . 30

РЭЦЭНЗІІ
*С.Ё.* Лёс аднаго пакаленьня . . . . . 31

ДА 140-ГОДЗЬДЗЯ ПАЎСТАНЬНЯ КАЛІНОЎСКАГА
*Аляксандар Харытон*. У Красным пахаваны апошні ўдзельнік паўстаньня . . . . . 32

## АД РЭДАКЦЫЙНАЙ КАЛЕГІІ

*Гэтым пачынаем выданьне бюлетэню Беларускага грамадзкага аб’яднаньня “Ветэраны Адраджэньня”. Плянуецца зьмяшчаць у ім матэрыялы з гісторыі адраджэнскіх рухаў: біяграфіі, успаміны, дакумэнты й г.д., а таксама зьвесткі пра дзейнасьць аб’яднаньня, яго цэнтральных органаў, гарадзкіх і раённых арганізацый.*

*Посьпех гэтай справы магчымы толькі пры нашых супольных намаганьнях. Таму чакаем актыўнасьці ад сяброў як зь Менску, так і з рэгіёнаў.*

*Дык жа з Пагоняй у сэрцы — у добры шлях.*

## ЗВАРОТ
## Аргкамітэту па стварэньні грамадзкага аб’яднаньня “Ветэраны Адраджэньня»”

Будзьма разам!

Сёньня, на парозе 3-га тысячагодзьдзя, азіраючы мінулае й ўглядаючыся з трывогай і надзеяй у будучыню, мы зьвяртаемся да вас, суайчыньнікі, сябры, калегі й аднадумцы, ветэраны нацыянальнага руху Беларусі. Дзе б вы ні былі — на Радзіме ці ў замежных краінах — гуртуймася пад нашымі спрадвечнымі сімваламі, каб бараніць спрадвечныя людзкія каштоўнасьці: свабоду асобы й незалежнасьць Краіны. Зьяднаймася, каб разам пераадолець катастрафічную разьяднанасьць, песімізм і разгубленасьць. З гэтай мэтай ствараецца **новая грамадзкая арганізацыя — згуртаваньне ўдзельнікаў адраджэнскіх, незалежніцкіх, вызвольных рухаў.**

Запрашаем да супрацоўніцтва ўсіх, хто на працягу апошніх дзесяцігодзьдзяў бараніў ад вынішчэньня нашу культуру й мову, нашу прыроду й гісторыю, нацыянальную годнасьць і свабоду. Партыйная, канфесійная, нацыянальная прыналежнасьць, сацыяльны статус і ўзрост значэньня ня маюць.

Будзьма разам у галоўным! Дробнае — разам пераадолеем.

З Новым годам, дарагія сябры!

*Уладзімер Крукоўскі*
*Міхась Чарняўскі*
*Зьдзіслаў Сіцька*
*Аляксей Марачкін*
*Зьміцер Санько*
*Уладзімер Арлоў*
*Валер Мазынскі*

Сьнежань 2000 г.

# С Т А Т У Т
# Беларускага грамадзкага аб’яднаньня
# “Ветэраны Адраджэньня”

1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭНЬНІ

1. 1. Беларускае грамадзкае аб’яднаньне “Ветэраны Адраджэньня” (далей па тэксце — БГА “Ветэраны Адраджэньня”) — добраахвотная рэспубліканская грамадзкая арганізацыя культурна-асьветніцкага й сацыяльнага кірунку дзейнасьці.

1.2. БГА “Ветэраны Адраджэньня” дзейнічае на тэрыторыі Беларусі згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.01.1999 г. № 2, Законам Рэспублікі Беларусь “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях”, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь і гэтым Статутам.

1.3. БГА “Ветэраны Адраджэньня” зьяўляецца юрыдычнай асобай, мае ўласныя банкаўскія рахункі ў рублях і замежнай валюце, пячатку, і нясе абавязкі й адказнасьць згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

1.4. БГА “Ветэраны Адраджэньня” адказвае па сваіх абавязацельствах уласнай маёмасьцю.

1.5. Арганізацыйныя структуры БГА “Ветэраны Адраджэньня” могуць набываць статус юрыдычных асоб па рашэньні Управы.

1.6. БГА “Ветэраны Адраджэньня” дзеля выкананьня сваіх задач можа стаць раўнапраўным членам блізкіх па мэтах міжнародных няўрадавых арганізацый, падтрымліваць прамыя міжнародныя сувязі, заключаць адпаведныя пагадненьні, а таксама ўдзельнічаць у мерапрыемствах, якія не супярэчаць заканадаўству й міжнародным абавязацельствам Рэспублікі Беларусь.

1.7. Справаводства ў БГА “Ветэраны Адраджэньня” ажыцьцяўляецца ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі заканадаўства. Дакумэнтацыя, якая вызначана заканадаўствам, здаецца ў адпаведныя ўстановы Нацыянальнага архіўнага фонда.

1.8. Поўная назва на беларускай мове — Беларускае грамадзкае аб’яднаньне “Ветэраны Адраджэньня”, на рускай мове — Белорусское общественное объединение “Ветераны Возрождения”, на англійскай мове — Belarusian Public Organization “Veterans of the Revival”.

1.9. Юрыдычны адрас БГА “Ветэраны Адраджэньня”: 220040 г. Менск, вул. М. Багдановіча, 155, прыбудова да 1 корп., пак. 128.

2. МЭТЫ, ЗАДАЧЫ І МЕТАДЫ ДЗЕЙНАСЬЦІ БГА “ВЕТЭРАНЫ АДРАДЖЭНЬНЯ”

2.1.Мэтамі дзейнасьці БГА “Ветэраны Адраджэньня” зьяўляюцца:

— гуртаваньне ўдзельнікаў беларускага адраджэнскага руху, дасьледваньне й папулярызацыя іх дзейнасьці ў перыяд да 1990 г.,

— арганізацыя сацыяльнай і іншай дапамогі членам БГА “Ветэраны Адраджэньня” й іх сем’ям.

2.2. Задачамі БГА “Ветэраны Адраджэньня” зьяўляюцца:

— збор і вывучэньне матэрыялаў аб працы й дзейнасьці арганізацый і асоб, якія мелі дачыненьне да ўсталяваньня дэмакратычных каштоўнасьцяў і правоў чалавека, да адраджэньня беларускай культуры, мовы, нацыянальнай самасьвядомасьці й дзяржаўнасьці;

— навуковая, кансультацыйная, вучэбная й метадычная дзейнасьць у адпаведнасьці з статутнымі мэтамі й заканадаўствам;

— ушанаваньне памяці дзеячаў Адраджэньня.

2.3. БГА “Ветэраны Адраджэньня” дзеля ажыцьцяўленьня сваіх мэтаў і задач выкарыстоўвае наступныя метады:

— папулярызуе (праз канферэнцыі, семінары ды інш., а таксама праз друк) дзейнасьць удзельнікаў беларускага Адраджэньня;

— аказвае гуманітарную дапамогу членам БГА “Ветэраны Адраджэньня” ды іх сем’ям;

— дзеля выкананьня статутных задач стварае клубы, гурткі ды інш.

2.4. БГА “Ветэраны Адраджэньня” можа ў адпаведнасьці з заканадаўствам:

— засноўваць уласныя сродкі масавай інфармацыі, ажыцьцяўляць выдавецкую дзейнасьць;

— ажыцьцяўляць вытворча-гаспадарчую дзейнасьць, накіраваную на вырашэньне статутных мэтаў і задач.

3. ЧЛЕНЫ БГА “ВЕТЭРАНЫ АДРАДЖЭНЬНЯ”, ІХ ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ

3.1. Членства ў БГА “Ветэраны Адраджэньня” фіксаванае.

3.2. Членамі БГА “Ветэраны Адраджэньня’ могуць быць грамадзяне Рэспублікі Беларусь і замежныя грамадзяне, а таксама асобы без грамадзянства, якія дасягнулі паўналецьця, пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і прызнаюць дадзены Статут, і якія ў перыяд да 1990 г. сваёй творчасьцю, прафэсійнай дзейнасьцю й грамадзянскай пазіцыяй садзейнічалі ўсталяваньню дэмакратычных каштоўнасьцяў і правоў чалавека, адраджэньню беларускай культуры, мовы, нацыянальнай самасьвядомасьці й дзяржаўнасьці;

3.3. Прыём членаў ажыцьцяўляецца на падставе пісьмовай заявы ўправай або сходам аддзяленьня, а пры адсутнасьці аддзяленьня — Управай БГА “Ветэраны Адраджэньня”.

3.4. Члены БГА “Ветэраны Адраджэньня” маюць права:

— выбіраць і быць абранымі ў выбарныя органы БГА “Ветэраны Адраджэньня”;

— уносіць на разгляд органаў БГА “Ветэраны Адраджэньня” прапановы па сутнасьці работы арганізацыі;

— атрымліваць ад органаў БГА “Ветэраны Адраджэньня” любую інфармацыю, неабходную для выкананьня статутных задач;

— браць удзел ва ўсіх мерапрыемствах БГА “Ветэраны Адраджэньня”.

3.5. Члены БГА “Ветэраны Адраджэньня” абавязаны:

— трымацца палажэньняў Статута;

— удзельнічаць у выкананьні задач і мэтаў БГА “Ветэраны Адраджэньня”;

— падтрымліваць па магчымасьці БГА “Ветэраны Адраджэньня” матэрыяльна.

3.6. Членства ў БГА “Ветэраны Адраджэньня” спыняецца з прычыны:

— выхаду з арганізацыі па ўласным жаданьні;

— выключэньня з членаў БГА “Ветэраны Адраджэньня” за грубае парушэньне Статута.

3.7. Выключэньне й афармленьне выхаду з членаў БГА “Ветэраны Адраджэньня” ажыцьцяўляецца ўправай або сходам аддзяленьня, а пры адсутнасьці аддзяленьня — Управай БГА “Ветэраны Адраджэньня”. Рашэньне аб выключэньні прымаецца не менш як 2/3 галасоў прысутных і можа быць абскарджана на Ўправе БГА “Ветэраны Адраджэньня” або на Канферэнцыі.

## 4. НАЙВЫШЭЙШЫ Й ВЫБАРНЫЯ ОРГАНЫ, СТРУКТУРА БГА “ВЕТЭРАНЫ АДРАДЖЭНЬНЯ”

4.1. Органамі БГА “Ветэраны Адраджэньня” зьяўляюцца:

— Канферэнцыя дэлегатаў БГА “Ветэраны Адраджэньня” — найвышэйшы орган;

— Управа БГА “Ветэраны Адраджэньня” — кіраўнічы орган.

— Кантрольная камісія БГА “Ветэраны Адраджэньня” — кантрольна-рэвізійны орган.

4.2. Выбарныя органы БГА “Ветэраны Адраджэньня” правамоцныя пры ўдзеле ў іх пасяджэньнях больш за палову членаў органаў. Рашэньні прымаюцца простай большасьцю галасоў прысутных.

4.3. Старшыня БГА “Ветэраны Адраджэньня” выбіраецца тэрмінам на два гады таемным або адкрытым галасаваньнем. Адна асоба не можа быць Старшынёй больш як два тэрміны запар.

4.4. Кіруючы й кантрольна-рэвізійны органы выбіраюцца тэрмінам на два гады таемным або адкрытым галасаваньнем, форму галасаваньня вызначае Канферэнцыя.

4.5. Канферэнцыя вырашае любыя пытаньні дзейнасьці БГА “Ветэраны Адраджэньня”, у тым ліку:

— вызначае асноўныя кірункі дзейнасьці БГА “Ветэраны Адраджэньня”, агульны парадак выкарыстаньня матэрыяльных сродкаў;

— прымае Статут, уносіць у яго зьмены й дапаўненьні;

— выбірае Старшыню БГА “Ветэраны Адраджэньня”, які па пасадзе ўвыходзіць у склад Управы;

— вызначае колькасны склад і выбірае Управу, Кантрольную камісію й яе Старшыню;

— заслухоўвае справаздачы Старшыні БГА “Ветэраны Адраджэньня”, Управы, Кантрольнай камісіі.

4.6. Канферэнцыя БГА “Ветэраны Адраджэньня” зьбіраецца не радзей чым адзін раз на 2 гады й лічыцца правамоцнай пры наяўнасьці не менш за 2/3 агульнай колькасьці дэлегатаў.

4.7. Канферэнцыя склікаецца па рашэньні Управы БГА “Ветэраны Адраджэньня”, або па патрабаваньні не менш чым 1/2 аддзяленьняў БГА “Ветэраны Адраджэньня”.

4.8. Управа кіруе працай БГА “Ветэраны Адраджэньня” у прамежках паміж Канферэнцыямі й зьбіраецца не радзей як адзін раз на паўгода.

4.9. Управа:

— па прапанове Старшыні БГА “Ветэраны Адраджэньня” вызначае колькасьць намесьнікаў Старшыні й таемным або адкрытым галасаваньнем выбірае іх з членаў Управы;

— вызначае парадак вылучэньня дэлегатаў на Канферэнцыю БГА “Ветэраны Адраджэньня” й дату яе правядзеньня, пра што аддзяленьні інфармуюцца не пазьней чым за месяц да Канферэнцыі;

— вызначае штатны расклад найманых работнікаў, зацьвярджае іх найманьне й вызначае памер заработнай платы, зацьвярджае памер матэрыяльнага заахвочаньня членаў БГА “Ветэраны Адраджэньня” за канкрэтна выкананыя работы;

— зацьвярджае каштарыс і справаздачу аб выкананьні каштарыса;

— выпрацоўвае праграмы дзейнасьці БГА “Ветэраны Адраджэньня” у адпаведнасьці з Статутам і рашэньнямі Канферэнцыі;

— выпрацоўвае кірункі вытворча-гаспадарчай дзейнасьці БГА “Ветэраны Адраджэньня”;

— распараджаецца маёмасьцю згодна з Статутам, рашэньнямі Канферэнцыі й заканадаўствам;

— перыядычна заслухоўвае справаздачы Старшыні БГА “Ветэраны Адраджэньня” ды яго намесьнікаў аб выкананьні рашэньняў Канферэнцыі й Управы;

— зацьвярджае ўтварэньне аддзяленьняў і каардынуе іх дзейнасьць;

— зацьвярджае ўзоры сімволікі, пячатак, штампаў ды іншай атрыбутыкі;

— уносіць зьмены й дапаўненьні ў Статут згодна з патрабаваньнямі заканадаўства;

— прымае рашэньне аб скліканьні Канферэнцыі й норме прадстаўніцтва на ёй,

— разглядае й вырашае іншыя пытаньні дзейнасьці БГА "Ветэраны Адраджэньня".

4. 10. Старшыня БГА "Ветэраны Адраджэньня" й яго намесьнікі дзеля вырашэньня пабежных пытаньняў утвараюць Прызідыум Управы, які зьбіраецца не радзей, чым адзін раз на месяц.

4.11. Старшыня БГА "Ветэраны Адраджэньня" зьяўляецца кіраўніком юрыдычнай асобы й валодае ўсімі яго правамі й абавязкамі, у тым ліку:

— арганізуе працу Управы й Прэзідыума Управы;

— прадстаўляе БГА "Ветэраны Адраджэньня" пры кантактах зь іншымі арганізацыямі, установамі й асобамі;

— ажыцьцяўляе прыём на апрацу тэхнічных работнікаў адпаведна штатнага раскладу.

4.12. Намесьнікі Старшыні БГА "Ветэраны Адраджэньня":

— дапамагаюць Старшыні ў выкананьні яго абавязкаў;

— адказваюць за пэўны кірунак дзейнасьці БГА "Ветэраны Адраджэньня", вызначаны Управай;

— па даручэньні Прэзідыума прадстаўляюць БГА "Ветэраны Адраджэньня" пры кантактах з іншымі арганізацыямі, установамі й асобамі;

— па даручэньні Старшыні БГА "Ветэраны Адраджэньня" адзін з намесьнікаў выконвае функцыі Старшыні пры яго адсутнасьці.

4.13. Кантрольная камісія, якая свае пасяджэньні праводзіць не радзей як адзін раз на год:

— кантралюе выкананьне дадзенага Статута, пастаноў Канферэнцыі й Управы, фінансавую й гаспадарчую дзейнасьць БГА "Ветэраны Адраджэньня" і яго структур;

— правярае работу з прапановамі й скаргамі членаў БГА "Ветэраны Адраджэньня";

— інфармуе Управу й справаздачная перад Канферэнцыяй аб выніках сваіх праверак.

Члены Кантрольнай камісіі не могуць уваходзіць у выбарныя органы БГА "Ветэраны Адраджэньня" й працаваць у яе гаспадарчых структурах.

4.14. Пры наяўнасьці па месцы жыхарства пяці й болей членаў БГА "Ветэраны Адраджэньня" ствараюцца раённыя, гарадзкія (Менская гарадзкая) аддзяленьні. У сваёй дзейнасьці яны кіруюцца дадзеным Статутам.

4.15. Вышэйшым органам аддзяленьня БГА "Ветэраны Адраджэньня" зьяўляецца сход. Сход правамоцны пры ўдзеле ў яго рабоце больш як паловы членаў аддзяленьня.

4.16. Сход:

— вызначае зьмест і кірункі дзейнасьці аддзяленьня ў межах Статута, а таксама формы галасаваньня пры прыняцьці рашэньняў;

— вызначае колькасны склад і выбірае ўправу, старшыню (яго намесьніка) і рэвізора аддзяленьня, заслухоўвае й зацьвярджае іх справаздачы.

4.17. Кіраўніча-выканаўчым органам аддзяленьня зьяўляецца ўправа, а пры колькасьці членаў у арганізацыі не болей за 10 чалавек кіраўніча-выканаўчыя функцыі ажыцьцяўляе старшыня аддзяленьня.

4.18. Усе рашэньні калегіяльных органаў афармляюцца пратаколамі.

5. МАЁМАСЬЦЬ І ГРАШОВЫЯ СРОДКІ БГА "ВЕТЭРАНЫ АДРАДЖЭНЬНЯ"

5.1. Ва ўласнасьці БГА "Ветэраны Адраджэньня" можа быць любая маёмасьць, неабходная для забесьпячэньня статутнай дзейнасьці арганізацыі, за выключэньнем аб'ектаў, якія згодна з заканадаўствам могуць знаходзіцца толькі ва ўласнасьці дзяржавы.

5.2. Маёмасныя й грашовыя сродкі БГА "Ветэраны Адраджэньня" фармуюцца за кошт:

— добраахвотных ахвяраваньняў грамадзян, установаў, арганізацый, прадпрыемстваў як з Беларусі, так і з замежжа;

— прыбыткаў ад выдавецкай, вытворча-гаспадарчай і іншай не забароненай заканадаўствам дзейнасьці;

— іншых паступленьняў, не забароненых заканадаўствам.

5.3. Грашовыя сродкі БГА "Ветэраны Адраджэньня" захоўваюцца на банкаўскіх рахунках і выдаткоўваюцца на мерапрыемствы, прадугледжаныя Статутам, рашэньнямі Канферэнцыі й Управы.

5.4. БГА "Ветэраны Адраджэньня" не адказвае па даўгах і абавязацельствах сваіх членаў, таксама як і яны не адказваюць па даўгах і абавязацельствах Аб'яднаньня.

6. МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ БГА "ВЕТЭРАНЫ АДРАДЖЭНЬНЯ"

6.1. БГА "Ветэраны Адраджэньня" мае права ўступаць у міжнародныя няўрадавыя арганізацыі, падтрымліваць прамыя міжнародныя сувязі, заключаць адпаведныя пагадненьні, а таксама ўдзельнічаць у мерапрыемствах, якія не супярэчаць заканадаўству й міжнародным абавязацельствам Рэспублікі Беларусь.

7. СІМВОЛІКА БГА "ВЕТЭРАНЫ АДРАДЖЭНЬНЯ"

7.1. БГА "Ветэраны Адраджэньня" можа мець свае сімвалы (сьцяг, эмблему, вымпелы й інш.), якія зацьвярджаюцца Управай і рэгіструюцца ў адпаведнасьці з дзейным заканадаўствам.

8. СПЫНЕНЬНЕ ДЗЕЙНАСЬЦІ БГА "ВЕТЭРАНЫ АДРАДЖЭНЬНЯ"

8.1. Дзейнасьць БГА "Ветэраны Адраджэньня" можа

быць спынена па рашэньні Канферэнцыі або Вярхоўнага суда.

8.2. Рашэньне аб спыненьні дзейнасьці БГА “Ветэраны Адраджэньня” правамоцнае, калі за яго прагаласавала больш за 2/3 абраных дэлегатаў Канферэнцыі.

8.3. Маёмасьць і грашовыя сродкі, што засталіся пасьля пагашэньня крэдытаў, накіроўваюцца на мэты, прадугледжаныя Статутам.

*Статут прыняты ў Менску на Устаноўчым сходзе 25 лістапада 2001 г.*

*Статут зарэгістраваны Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь 21 лістапада 2002 г.*

*Пасьведчаньне аб рэгістрацыі № 01156*

* * *

**Кіраўніцтва аб’яднаньня**

Старшыня
*Міхась Чарняўскі*

Намесьнікі Старшыні:

*Уладзімер Арлоў*
*Аляксей Марачкін*
*Уладзімер Крукоўскі*
*Зьміцер Санько*

Управа

*Уладзімер Арлоў (Менск)*
*Надзея Дземідовіч (Калодзішчы, Менская вобл.)*
*Сяргей Ёрш (Слонім)*
*Аляксандар Жук (Баранавічы)*
*Таіса Кабанчук (Бабруйск)*
*Уладзімер Крукоўскі (Менск)*
*Валер Мазынскі (Менск)*
*Аляксей Марачкін (Менск)*
*Зьміцер Санько (Менск)*
*Зьдзіслаў Сіцька (Менск)*
*Алег Табола (Менск)*
*Зінаіда Тарасевіч (Менск)*
*Канстанцін Харашэвіч (Маладзечна)*
*Міхась Чарняўскі (Менск)*

Рэвізійная камісія

*Эдвард Зайкоўскі — старшыня (Менск)*
*Сьвятлана Бакун (Баранавічы)*
*Уладзімер Плакса (Менск)*

**Эмблема аб’яднаньня**

Эмблема Беларускага грамадзкага аб’яднаньня “Ветэраны Адраджэньня” уяўляе сабой выяву:

у круглым блакітным полі зьмешчаны тры ўкладзеныя адна ў адну лацінскія літары “V”: V белая — veritas (праўда), V чырвоная — valentia (сіла), V белая — victoria (перамога); кампазіцыя ўвенчана чатырохканцовым кавалерскім (рыцарскім) крыжам белага колеру — сімвалам высакародства й традыцыйных хрысьціянскіх каштоўнасьцяў.

*Янка Купала*

## Беларускі сьцяг уваскрос!

Кароценька вестка, атрыманая намі ўчора з Варшавы, што ў чацьвер, 23 кастрычніка сёлетняга году, Польшча падпісала аб фармаваньні Беларускага нацыянальнага войска, павінна абудзіць у кожнага Беларуса й наагул у кожнага грамадзяніна, жывучага вечна ў нашым краю, вялікае здавальненьне й сьвяточную радасьць.

Агністымі літарамі гэты надзвычайны дзень будзе ўпісан у векавечную кнігу гісторыі народаў і дзяржаваў, асабліва гісторыі Беларускага народу й Беларускай дзяржавы.

У гэты дзень уваскрос беларускі сьцяг.

З гэтага дня маем магчымасьць будаваць сваю беларускую армію, сваю аружную, нязломную сілу, каторая ў хуткім часе павінна выйсьці на ваенныя шляхі й бараніць беларускія акрываўленыя межы.

Хай жа Беларусь пакажа, што яе верныя сыны здольны праліваць сваю гарачую кроў ня толькі за чужую карысьць і панаваньне, але таксама патрапяць здабыць і для сваёй зямлі лепшую долю й лепшую славу.

Хай пойдзе кліч ад места да места, ад вёскі да вёскі, ад хаты да хаты, хай пойдзе кліч па ўсёй Беларускай зямлі, — па гэты й па той бок ваеннай мяжы, — што надыйшоў дзень беларускага народу, калі ён можа збройна заступіцца за сябе самога й за сваю Айчыну.

Ідэя будаваньня свайго незалежнага жыцьця паднявольнымі народамі, якая загарэлася вечным жывым агнём пасьля развалу Расейскай самаўладнай імперыі, каторая душыла пад сваёй нагой усе праявы вольнага духу, — гэта ідэя сягоньня ператвараецца ў жыцьцё, становіцца жывым дзелам, цьвёрдым фактам.

Палажэньне гістарычнае й геаграфічнае Беларусі было й ёсьць пакуль што найцяжэйшае ад усіх іншых падобных да яе, вызваленых з царска-рабскага гнёту, дзяржаваў.

І вось цяпер гэта палажэньне мяняецца на лепшае. Нам даюць наш сьцяг у рукі й гэты сьцяг мы павінны з трыумфам вынесьці на жыватворнае сьвятло будучыні, вынесьці з гордасьцю, з гонарам і славай, — сьцяг не абы які, а свой, беларускі.

Хай жа гэтая думка, што мы будуем сваю Бацькаўшчыну ня толькі для сягоньняшняга бурлівага часу, але й для будучых прыхільнейшых вякоў, павядзе нас “к свабодзе, роўнасьці й знаньню”.

Будучы самі вольнымі, мы патрапім ацаніць волю другіх і пайсьці зь імі, “як вольны з вольным”. Стаўшы самі нараўне паміж усіх народаў, мы зможам ім сказаць: “ідзем з вамі як роўны з роўным”.

“Вясна народаў”, аб каторай так разьліваліся воклікі па цэлым сьвеце, не была да апошняга часу вясной для беларусаў. Гэта было цяжкае галоднае прадвесьне, як і кожнае прадвесьне ў гаспадара-беларуса. Не вясна, а восеньская слата была.

Але гісторыя народаў у нашы часы творыцца не гадамі, а днямі. Кожны дзень штось прыносе, кожны дзень творыць штось новае, вялікае.

Выбіла часіна й для нас. Выбіла можа ў найцяжэйшую мінуту нашага палітычнага жыцьця. Дзьве вялікія, не нашыя арміі стаяць адна проці другой на беларускіх гонях.

І вось сягоньня стане трэйцяя армія на гэтых гонях — армія беларуская.

Хай жа гэтая армія стане абаронай свае Айчыны!

Беларускі сьцяг уваскрос!

Хай беларуская армія ня дасьць яму болей памерці.

*“Беларусь”, № 9 (36), 30 кастрычніка 1919 г.*

## Збалелае сэрца

*Падаем выняткі зь ліста Якуба Коласа, перададзенага ў Бюро ЦК КПБ 25 траўня 1956 году за некалькі гадзін да сьмерці. Ліст быў схаваны ў партархіве й ўбачыў сьвет толькі ў 1990 годзе на старонках тыднёвіка “Літаратура і мастацтва”.*

... Установы сталіцы вывелі з ужытку беларускую мову: на ёй не вядзецца перапіска, на ёй не гавораць з наведвальнікамі, у гарадах няма беларускіх шыльд і надпісаў, мала беларускіх афіш і плакатаў...

Беларускую мову можна пачуць у тэатрах і па радыё. Але што гэта за мова? Гэта непрыхаваны зьдзек над ёю. Артысты й дыктары парушаюць элементарныя правілы вымаўленьня, пастаноўкі націскаў, мова засьмечана мноствам скажоных слоў-калек з рускай мовы. Адбываецца гэта таму, што артысты, работнікі радыё, журналісты, газэтчыкі не карыстаюцца мовай у побыце...

Студыя “Беларусьфільм” здымае фільмы на рускай мове, а потым дубліруе іх на беларускую. Такім шляхам нацыянальную кінематаграфію не створыш. Дарэчы, дубліраваныя фільмы не зьяўляюцца на экранах сталіцы, дзе й як яны ідуць, невядома.

...У вузах, тэхнікумах, школах выкладаньне не вядзецца па-беларуску, наша мова выкладаецца кепска, так што робіцца нялюбым прадметам. Беларускіх школ мала, яны разьмешчаны на ўскраінах, у горшых будынках, у горшых умовах, як бы сумысна, каб малыя дзеці насельніцтва не маглі дабрацца туды. Нават у многіх школах вясковых мясцовасцей беларускага толькі й засталося, што паржавелыя шыльды над ганкам...

У пэўны час — ці трэба тлумачыць, калі й чаму гэта было? — вялікая група інтэлігенцыі перастала карыстацца сваёй мовай. Абазвацца па-беларуску тады зна-

чыла зарабіць ярлык нацыяналіста... Дык вось, баючыся быць пакаранымі безь віны, людзі пакідалі гаварыць па-беларуску, а потым, натуральна, пакрысе й забывалі мову. Гэтак са старэйшымі. Моладзь, падрастаючы, пачала ўжо нігілістычна адносіцца да мовы: нашто яе вывучаць, калі яна ня мае практычнага прыстасаваньня, не ўжываецца для выкладаньня, для перапіскі, не гучыць на сходах...



## Зь ліста Бранiслава Ржэўскага Старшыні Камісіі заканадаўчых прапановаў Савета Саюза Д.С. Палянскаму

Председателю Комиссии эаконодательных предложений Совета Союза Д. С. Полянскому

от Ржевского Бронислава Андреевича,

1905 г. рожд., уроженца дер. Добрицкое Борисовского района Минской области, белоруса, г-на СССР, беспартийного, семейного, имеющего высшее образование, кандидата филологических наук, ранее не судимого, до ареста работавшего старшим преподавателем Гродненского techинститута, приговоренного судебной коллегией по уголовным делам Гродненского областного суда 25 марта 1957 г. по ст. 72-а УК БССР к лишению свободы сроком на семь лет с последующим поражением в избирательных правах на пять лет, ныне находящегося в ИТЛ Мордовской АССР, Зубово, Полянский р-н, п/я 385/7.

(…)

Третий год я нахожусь в заключении. Но меня мучает не столько заключение, сколько горе и страдание от убежденности в своей невиновности и в сознании незаконности судебного приговора. Свободные часы своего тягостного заключения я посвятил одному: по трудам В.И.Ленина, по первоисточникам марксистской литературы проверить себя, найти свои ошибки. Этих ошибок у себя я не нашел и еще больше убедился, что прав я. Я обращаюсь к Вам и прошу только об одном: Разъясните мне, в чем я заблуждаюсь, в чем мое уголовное преступление?

(…)

Но с 30-х годов в вопросах естественных и исторических прав белорусского языка, его конституционных прав начался обратный процесс тому, который проводился до 30-х годов. Началось всеобщее вытеснение белорусского языка из государственных и партийных учреждений, из школ и высших учебных заведений. В настоящее время в советских и партийных органах белорусский язык не существует. Дошло до того, что в органах милиции нет людей, которые могли бы грамотно по-белорусски заполнить паспорт.

(…)

Я прошу Вас, разъясните мне, в силу каких реальных законов (кем и когда изданных) белорусский язык в БССР оказался изгнанным из партийных и советских органов и заменен русским языком (тогда как русский язык является в СССР для союзных республик только языком интернациональных связей)? Почему суды в БССР защиту мною известных партийных решений по вопросу о языках нацменьшинств в союзных республиках квалифицируют контрреволюционными действиями и социально опасными?

(…)

Статья 86 Конституции БССР и статья 110 Конституции СССР обязывает органы прокуратуры и всё судопроизводство в республике вести на белорусском языке. За последние 25 лет ни одного судебного дела не было оформлено на белорусском языке. Где, в какой стране можно встретить такое отношение прокуратуры и суда к законам собственной страны?

Я прошу мне разъяснить, по какому советскому закону десятки лет судебно-следственные органы в БССР безнаказанно игнорировали статьи 110 и 86 Конституции СССР и БССР? Почему судьи в БССР так легко выносят суровые приговоры гражданам, которые поднимают голос в защиту конституционных прав своего народа?

(…)

Статья 96 Конституции БССР и статья 121 Конституции СССР обеспечивают права гражданам БССР на воспитание и обучение на родном языке. Может ли осуществиться это право практически при условии, что:

а) в средних и высших педагогических учебных заведениях БССР преподавание ведется только на русском языке, и будущие педагоги, естественно, не подготовлены вести преподавание на белорусском языке;

б) в органах народного образования, как и во всех других советских учреждениях, белорусский язык практически исключен, а контроль школ проводят люди, в большинстве случаев не владеющие белорусским языком;

в) когда в школы, которые официально числятся с преподаванием на белорусском языке, на работу директоров, завучей, пионервожатых, библиотекарей по-

сылаются люди, не владеющие белорусским языком;

г) когда во всех городах и райцентрах БССР все школы с белорусским языком преподавания были закрыты. При этом причиной, поводом для закрытия белорусских школ чаще всего было: кто-то из руководящих работников не пожелал своих детей обучать в школе с белорусским языком преподавания;

д) когда во всех детских яслях, детских садах в БССР белорусские дети не слышат белорусского слова. Когда со дня рождения они отрываются от своей родной почвы.

(...)

*Б.Ржевский*
Дубровлаг. 1959 г., 20-го мая

*Мікола Канаш*
## Паэт Віталь Губарэвіч

*Падаем урывак зь ліста Міколы Канаша Міхасю Чарняўскаму за 14.02.1994 г. пра Віталя Губарэвіча. Ён быў сябрам Саюза Вызваленьня Беларусі з цэнтрам у Наваградку (1946—1947 гг.), упаўнаважаным арганізацыі па Дзятлаўскім раёне. Арыштаваны ў траўні 1947 г.*

Зь Віталём Губарэвічам мне давялося пазнаёміцца ў страшных умовах ГУЛагу 45 гадоў таму ў пасёлку Інта Комі АССР на 1-м ОЛП-е. Нічым асабліва ён не адрозьніваўся ад іншых зьняволеных: той жа бушлат з нумарам на сьпіне, тая ж аблавушка з featнакаляровых кавалачкаў тканіны на галаве, засмуголеныя невядомага колеру штаны ды кароценькія абгарэлыя вайлакі на нагах. Невысокага росту, з хударлявым тварам, на якім тырчэў нос. Уражвалі хіба вялікія вочы бледна-шэрага колеру. Ён, як пасьля казаў мне, хварэў на сухоты. А родам быў з Дзятлаўскага раёну, што на Гарадзеншчыне. Пісаў вершы на беларускай і расейскай мовах.

На той час я ўжо быў знаёмы з Ларысай Геніюш, якая знаходзілася тамсама, толькі на 4-м ОЛП-е, жаночым. Аднаго разу я пару Віталёвых вершаў адаслаў Ларысе. І неўзабаве атрымаў адказ, што яны яшчэ далёка не дасканалыя, але нічога — няхай піша надалей, ня варта адбіваць у яго ахвоту пісаць...

Наўпрост Віталь з Ларысай не ліставаўся, а час ад часу аддаваў мне свае лісты пераважна ў вершаванай форме, каб я адаслаў ёй. Але такая перапіска між імі працягвалася нядоўга. Узьніклі непаразуменьні ў думках, у поглядах, разважаньнях. Віталь лічыў сябе выхадцам зь беднай сялянскай сям'і, а Ларысу чамусьці далучаў да мяшчанаў і да тых, што стаялі "на версе". Вядома, ня меў рацыі. У адным зь лістоў ён пісаў: "Пішыць той, хто праўду любіць, а па-твойму — камуніст". Па натуры добры, ён у парыве злосьці ня ўмеў сябе стрымліваць. І ў дадатак яшчэ быў хворы.

У 1955 ці ў пачатку 1956 г. — адным словам ляжаў яшчэ сьнег і было зімна — на шахце № 2 забіла камбайнам нашага хлопца Міколу Граноўскага, ён быў з Шаркаўшчынскага раёну, што на Віцебшчыне. І мы, беларусы, вырашылі яго пахаваць па-Божаму. Быў гэта ўжо час "хрушчоўскай адлігі". Мікола Яцкевіч працаваў у інструмэнталцы шахты № 2 і дапамог цесьлярам зрабіць труну й крыж. Слаўка Прыстаўка арганізаваў збор грошай, і купілі касьцюм. Быў складзены й пададзены начальству лягера сьпіс зьняволеных беларусаў з шахты № 2 (каля 20-ці чалавек), каб дазволілі выйсьці з зоны на пахаваньне. Дазвол быў дадзены. Быў там і Віталь Губарэвіч, які прачытаў над магілай свой верш "На сьмерць Міколы Граноўскага". А па нейкім часе яму з бетону зрабілі помнік, дзе на мармуровай дошцы выразалі надпіс. Тэкст цяпер ужо дакладна ня памятаю, ведаю толькі, што ёсьць словы "Не забудзем цябе, сябра".

Пахаваны ён на могілках у лесе "Сангарадка" непадалёку ад "Пцічніка". Можа, тая мясьціна захавалася яшчэ й сёньня?

*Віталь Губарэвіч*
## Да Ларысы Геніюш

Зрадніла мяне Муза не у хаце,
Прыйшла за краты да мяне яна.
І першы гук мой аб нявольным браце
Зьляцеў у сьвет з турэмнага вакна.

Я ліру змайстраваў сваёй рукою,
І струны крыху тоўстыя на ёй,
І непрыемна чуць яе парою,
Бо вуха рэжа востры голас мой.

Ды што рабіць? І я сьпяваў калісьці
Лірычну песьню. Але гэты сьпеў
Гучаў у сёлах родных без карысьці
І не будзіў майго народу гнеў.

Прабач мне, самазванаму паэту,
Ў няроўнай вырасшаму барацьбе,
Што пасьвячаю Табе песьню гэту,
І што Сястрою называю ў ім Цябе.

Ты гамаю акордаў мілагучных
Напоўніла мне сэрца да краёў,
І вобразаў так родных, неадлучных
Чарга перад вачыма ўстала зноў.

І я за ліру ўзяўся міма волі,
І грозна песьня загула мая,
Яна пяе братам маім аб волі,
Аб нашых родных, дарагіх краях.

Але не плач у песьні гэтай льецца —
Яна гучыць, як атамана кліч,
Пракляццем грозным з сэрца майго рвецца,
Ўздымае помсты ўсенародны біч.

* * *

І пакуль ў маім краі бяздольным
Шчэ не змоўк гук радзімае мовы,
Буду несьці я брацьцям нявольным
Кастуся Каліноўскага словы.

Каб народ мой крывіцкі, слаўны
Разбудзілі слоў маіх стрэлы,
Каб у небе наш Сьцяг дзяржаўны
Узьвіўся бела-чырвона-белы.

Цісънуць сэрца тугою жалезнай
Драцяныя калючыя лапы,
Бо з Радзімы па тундры бязьмежнай
Ўсё ідуць ды ідуць этапы.

І у сэрцы нашым гнаіцца
Несьцярпіма балючая рана,
Аднак плакаць ня трэба вучыцца.
Не, хаўтуры спраўляць яшчэ рана!

*(1955 г. Комі АССР, Інта, 1-шы ОЛП)*
*Запісана з слоў Міколы Канаша (г. Жлобін)*

## Адозьве 50 гадоў

*Беларускія патрыёты змагаліся супраць сталінізму не толькі на Бацькаўшчыне, але й на эміграцыі. Эміграцыйныя арганізацыі імкнуліся данесьці да свайго народу голас праўды пра сапраўднае становішча ў краіне. Дзеля гэтага выкарыстоўвалі самыя розныя сродкі. У 1951 годзе ва ўсходнім сэктары Бэрліну, які знаходзіўся пад акупацыяй савецкіх войскаў, было раскідана 10 тысяч асобнікаў адозвы да беларускай моладзі савецкай Беларусі. Праўдападобна, разьлік быў на беларусаў, што служылі жаўнерамі й афіцэрамі ў савецкай арміі й былі расквартэраваныя ў сталіцы ГДР. Вынікі акцыі беларускіх эмігрантаў пакуль нам невядомыя. Адозву перадрукоўваем бязь зьменаў.*

БЕЛАРУСКАЯ МОЛАДЗЬ!

Ты маеш рэдкую нагоду пачуць словы праўды ад тваіх братоў, якія вырваўшыся спад крывавае сталінскае апекі, жывуць сярод вольных народаў Захаду.

Бальшавікі ў сваёй прапагандзе прадстаўляюць Беларусь як адну з найшчасьлівейшых краінаў, а дзяржавы Захаду — як імпэрыялістых, што пасягаюць на ейнае «шчасьце».

ДЗЕ Ж ПРАЎДА?

Ці ж завецца шчасьцем тое, што бальшавікі, насуперак волі ўсяго нашага народу, здушылі Беларускую Народную Рэспубліку, абвешчаную ў 1918 годзе, ды замянілі яе фікцыяй, БССР, кіраванай насланымі Масквой камуністычнымі агентамі?

Хто папхнуў народ у нячуваную галечу, эксплуатуючы яго ў зьненавіджаных калгасах? Хто грабіць прыродныя багацьці Беларусі, выкарыстоўваючы іх для прапагаваньня крывавае сусьветнае рэвалюцыі? Хто вынішчае самабытную беларускую культуру, мову, падменьваючы яе савецка-расейскай стандаршчынай? Хто здушвае ўсялякае духовае жыцьцё ды свабоду выказваньня свае думкі, апутаўшы народ сеткай агентаў і сексотаў? Хто паслаў на сьмерць тысячы найлепшых беларускіх сыноў і мільёны народу! Хто на працягу апошніх дзесяцігодзьдзяў адказны за сьмерць:

500 беларускіх навукоўцаў,

70 паэтаў і пісьменьнікаў,

600 журналістых і соткі грамадзкіх ды палітычных дзеячоў,

20000 інтэлектуальных працаўнікоў — дактароў, інжынераў, настаўнікаў, студэнтаў,

больш за 3 мільёны сялян і работнікаў?

ЧЫРВОНАЯ МАСКВА!

Бальшавіцкія заправілы зусім безпадстаўна крычаць аб імпэрыялізьме заходняга сьвету, каб гэтым крыкам прыкрыць сваю падрыхтоўку да разбудаваньня турмы для ўсіх народаў

— СУСЬВЕТНАЕ РАСЕЙСКАЕ ІМПЭРЫІ.

Дык на чыім баку праўда?

Прыглядайцеся й судзеце! А пазнаўшы, дзейнічайце паводля вашага сумленьня, бо

ПРАЎДА ПЕРАМОЖА!

*Друкуецца паводле публікацыі ў газэце «За волю» (Парыж), 1951, №7, 15 кастрычніка.*

*Ларыса Геніюш*

## “У мяне столькі жалю і крыўды...”

*Знакамітая “Споведзь” Ларысы Геніюш ахоплівае перыяд яе жыцьця да вяртаньня з савецкіх канцлягераў. Пасяліўшыся з мужам у Зэльве, яна ліставалася з многімі сваімі сябрамі і знаёмымі, а таксама з колішнімі сулягернікамі. Лісты ішлі ў гарады Беларусі, Украіны, Польшчы, Амэрыкі, Канады... І ў адваротным кірунку таксама. Гэта было жыватворнае сумоўе для паэткі-патрыёта, асабліва пасьля сьмерці мужа, асочанай і абкладзенай спэцслужбамі ў невялікім мястэчку. Лістоў захавалася шмат і шмат*

*сотняў, калі не пару тысячаў. Апублікавана ж іх пакуль нязначная частка. Сабраныя ў адну кніжку, яны б склалі “Споведзь-2”... Прапануем увазе чытачоў некалькі лістоў Ларысы Геніюш да Сьвятланы і Міхася Чарняўскіх.*

Зэльва. 26/II-79 г.

Дарагі Сябра Міхась!

У бясконцым горы маім хоць крыху сьветла — гэта я так рада, што шчасліва прайшла Ваша аперацыя. Богу дзякую, што Вы на нагах.

(...) Добра, што напісалі. Ніхто, акрамя Вас, не зацікавіўся маім цяжкім лёсам і не прыняў такога шчырага ўдзелу ў нашым горы. Я ніколі не забуду мілай Н. (Элеаноры Вецер — *М.Ч*), і Сябру (Зянона Пазьняка — *М.Ч.*), і Вас. Быццам родныя ўжо мне, Міхась.

Жаль яшчэ скручвае сэрца. Людзі прыходзяць начаваць. Прынесьлі мне пэнсію — 33 руб. 25 кап. Нейк ужо будзе. Я зусім не бядую. Бядую толькі, што пачалася вайна на сьвеце (савецкая інвазія ў Аўганістан — *М.Ч.*). Каб хоць нейкім спосабам яе спыніць.

Што да вершаў, Сябра Міхась, дык я зусім не хачу іх друкаваць! А на 8-га сакавіка друкаваць іх было б проста непрызваіта! Я, зь нейкай сяброўскай шчырасьці, дала іх Сябру, а Ён во што нарабіў!!! Пачакайце крыху. У мяне і, здаецца, нават у Р. Барадуліна ёсьць мае лепшыя, недрукаваныя вершы. Гэта ж проста былі нататкі, часам — болю, часам — тугі. З гэтым Сябрам я яшчэ пагутару па свояму!

(...) Я буду пісаць, калі будуць друкаваць мяне, але крыху пасьля, як апамятаюся, як стану зусім нармальнай. Прашу Вас ласкаю, пакуль што няхай не друкуюць, бо будзе мне надта цяжка. Я магу ня вытрымаць болю. Самыя ведаеце, як мне тут было.

У мяне тут ёсьць яшчэ адна такая паэмка, але таксама “не гераічная”. У нас тут такі звычай, асабліва на Слонімшчыне, што ў часы вайны, каб адагнаць ад сяла бяду, дык людзі зьбіраюцца талакою і за адну ноч прадуць, ткуць ручнік, робяць крыж і ставяць яго ў канцы сяла, а ніткаю гэтаю тройчы абводзяць сяло! Забабон, безумоўна, але ж які харошы! Гэтая вера ў дабро і ласку не перашкаджае быць сільнымі, але як жа хораша згуртоўвае людзей у адну сям’ю! Вось гэта мяне захапіла.

“Ёсць павер’е ў народу майго —
як народ наш, легенда старая —
адганяць як агонь і вайну
ад сядзібаў ў гадзіну адчаю.
Ад Ярылы туманных часоў
празь сівыя легенды і казкі
гэты звычай за намі прыйшоў,
такі велічны, шчыры, славянскі.

—

Так баранілі бацькі і дзяды
край наш ў часы непакою,
недзе яшчэ ад набегаў арды,
ад голаду, мору і войнаў.”
(...)

* * *

Зэльва. 9/III-79 г.

Даражэнькія !

Вялікі дзякуй за ўвагу зь вершамі, а яшчэ болей дзякую за дасканалыя здымкі (фатаграфіі З.Пазьняка з пахаваньня І.Геніюша, мужа Ларысы Геніюш — *М.Ч.*). Мая ўдзячнасьць проста ня мае граніцаў. Я хацела б яшчэ мець болей здымкаў, гдзе мы ля труны ўсёй сям’ёю, і тых, што ў храме. Многа хто просіць на памяць і шмат трэба пасьлаць дарагім далёкім сябрам. Міхасёк, дарагі, ці ня знайдзеце недзе такіх канвертаў? Хоць крыху, каб пасьлаць за мяжу? Вельмі прашу Вас... Толькі я хацела б разьлічыцца за гэтыя цудоўныя здымкі. Яны, сапраўды, мастацкія. Я не магу і не хачу прычыняць Вам, маім найлепшым і дарагім, заўсёды нейкія кошты сваёю асобаю. Зразумейце мяне. Я крыху гордая, можа.

Кажуць, што я надта счарнела цяпер, схуднела куды болей, як ад бяссоньня ў часы хваробы с.п. Мужа. На гэта, мусіць, патрэбен час, каб прыйсьці ў сябе. Можа, вясною. Я сама адчуваю, што губляю сілы. Забягала лекар, якая лячыла с.п. Мужа. Высокі ціск крыві, сэрца, нэрвы. Выпісала “допегіт” і зноў “элеціум”. Учарашні дзень с.п. Мужавых нарадзінаў прайшоў у натоўпе дзетак суседзкіх, хрышчоных маіх і наогул людзей. У адной знаёмай зацьвіла вялікая белая кальля і яна прынесла яе зь лісьцямі з самай раніцы. Хрышчоныя сыны смажылі катлеты, накрывалі на стол. Іх маткі прыйшлі пад вечар. Нанесьлі дзеткі за свае “грошыкі ад мамаў” безліч парфумаў рознай велічыні, і што я толькі буду зь імі рабіць? Было міла, але я надта змучылася.

Сын піша мілыя лісты, усё кліча да сябе. Абяцае нават асобную кватэру, але як жа пакіну хату, магілу бяз помніка? Як? Баранавіцкія сябры (П.Рашэтнік і інш. — *М.Ч.*) абяцалі дапамагчы ў гэтым. Я яшчэ крыху гневаюся на дзяцей. Перадусім яны тут маглі пабыць даўжэй (...). Наогул было дрэнна з сынам, і я спалохалася да сьмерці, але аб гэтым некалі, пры сустрэчы. Толькі б Бог бараніў яго... Цяпер у мяне паявіўся яшчэ адзін страх...

Адным словам, я ўжо ня “злосны воўк” і ня “вытрывалы крэмень”, а пакуль толькі нейкі цень. Суседзі ўсё яшчэ не пакідаюць мяне ноччу, у кніжным адкладаюць яшчэ кніжкі для с.п. Івана Пятровіча. Часам прыходзяць людзі, якія разумеюцца на літаратуры. Раяць мне пісаць супраць вайны і галоўнае так, як паэт Раждзественскі і т.п. і т.д. А мне трашчыць галава зь нейкае слабасьці, і я нават ня ведаю, хто я.

Нашыя фатографы падзіўлялі здымкі і казалі, што і яны б зрабілі такія, як той іх “калега”, але апараты ня тыя, ды і папера. Колі (Міколы Канаша — *М.Ч.*) здымачкі вельмі цікавыя, але горшыя, буднейшыя. Вельмі цікавы здымачак, гдзе с.п. Муж ужо на могілках, а я над ім. Зрабеце яшчэ такіх крыху... І той цудоўны, гдзе відно Зэльву. А можа ёсьць яшчэ які іншы варыянт? У Колі усё відно стужку ад вянка “Ад працаўнікоў магазіна “Мяса—малако”. І як гэты вяночак усюды трапіў?

Рады, Міхасёк, што Вы папраўляецеся. Проста камень ужо з сэрца. Дзякуй вялікі Вам за ўсё. А як я тыя вершы буду пасылаць Вам поштаю? А калі яны ня зойдуць? Праўда, я яшчэ іх толькі пачала перапісваць, ды іх няшмат. Тую паэмку трэба перарабляць, але і на гэта патрэбная іскрачка. А можа лепш было б зусім маўчаць, каб не чыталі?

Апошні абрад па с.п. Мужу — гэта паніхіда І8/ІІІ у царкве і пасьля абед у хаце. Хацелася б бачыць хоць некага з вас, калі гэта хоць крышачку магчыма. Мне ўсё здаецца, што вы сваякі мае нейкія. Вось як зьбліжае нас, людзей, гора. Усё яшчэ начуюць пры мне суседкі. Дануся ў Гродне мяняе кватэру на лепшую, а нашыя аўстралійцы (беларускія эмігранты, сябры Геніюшаў — *М.Ч.*) прыслалі свае спагаданьні. Нехта ім напісаў.

За вокнамі ўсё яшчэ сьнег, на вуліцах коўзка.

Ня ведаю, ці змагу яшчэ напісаць кніжачку мілай Алесі, бо на гэта трэба мець вельмі добрае і чыстае сэрца, а ў мяне цяпер столькі жалю і крыўды. Толькі далёкія сябры завяраюць (яшчэ нас абаіх) у сваёй вернасьці і любові. Паводле старога павер’я цэлы год нельга бяліць і маляваць хаты, калі памрэ ў ёй нехта, дык пакуль што ўжо загадзя стараюся дровы на зіму, дагаварылася з Паўлам-баптыстам, што паправіць мне печ, і так час мінае.

Міхасёк, калі будуць тыя здымкі (у царкве і ўдома), дык ласкава занясеце два на адрас: Нина Константиновна Свито, ул. Платонова, (…). Я ім абяцала. Муж Ніны — адзін зь лепшых нэйрахірургаў ў Беларусі. Ня знаю, скуль яны даведаліся пра наша гора. Гэта нашыя добрыя знаёмыя. Можа будзе лепш — схадзіла б Сьвета? А можа, пашлеце поштай? Даруйце, што ўсё прашу нешта.

Застаюся з павагай да Вас усіх — Ларыса Геніюш.

Зэльва. 30/V-79 г.

Дарагі і паважаны Сябра Міхась!

(...) Самым трудным, з розных меркаваньняў, быў для мяне час непасрэдна па сьмерці с.п. Мужа. Я Вам вельмі дзякую за Вашыя лісты ў тую пару. Я думала, што ня выжыву. Часам з крутога болю і адзіноты ўцякала плачучы з хаты. Сьмерць — гэта нейкая вялікая несуразнасьць. (...)

Апошні час я ўсё глядзела на тюльпаны. Былі іх сотні ў мяне. Перацвілі, на жаль. Некалі с.п. Мужу я пасадзіла яблыньку. Яна цудоўна цьвіла. Людзі захапляліся ёю, а я плакала, як звычайна.

Пагода цяпер, дык весялей. Прасіла, каб людзі ўжо не прыходзілі нанач. Але звоніць нехта, а то суседка: “Ларыса Антонаўна, так грыміць, і мы падумалі, што, можа, Вам страшна?”. Мы доўга, доўга гутарылі зь ёю, пакуль паснулі.

Я ўжо крыху не баюся. Часам зрываюся са сну...

Вось бы паслаць Вам лісты дарагіх сяброў! (аўстралійскіх беларусаў — *М.Ч.*). (...) Я ведаю, што гэта значыць — туга па Бацькаўшчыне. З такой тугі некалі зрадзілася мая кніжка “Ад родных ніў”. Пазнаўшы глыбей смак жыцьця тут, я ўжо вылячылася з сэнтымэнтаў... Я хачу спакойна заснуць ля харошых людзей і, прачнуўшыся, ведаць, што мае сябры побач! У мяне нікога няма тут! Я зусім адна! “Высокадастойная і дарагая Спадарыня, Вы не адна — заўсёды можаце лічыць на нашую дапамогу, добрую волю ды сэрца”... Божа, як далёка да іх, нат буслы нашыя там ня лётаюць... Ня ведаю, якая будзе рэчаіснасьць, а ўсе мае мары схапілі адныя аўстралійскія ветры (там цяпер восень...) і носяць недзе па чужым кантыненце...

Пакуль тут, аднак, запэўніваю сабе апал на зіму... Як успомню самотныя вечары зімою, дык жудасна робіцца ...

А цяпер зацьвітаюць півоні. І іх у мяне вельмі многа. Гарод мне пасадзілі мілыя суседкі, я крыху толькі памагала. Лячу цяпер зубы, бо не магла раней пакінуць хворага Мужа. Нічога не пішу, бо пад пяро набягае адно — сьмерць. А людзям трэба пісаць праз мір, праз сонца і радасьць жыцьця. Пачакаю, Міхасёк.

(...)

*Віктар Шамянкоў*

## Як было ў Бабруйску

Нацыянальнае адраджэньне ў Бабруйску пачалося амаль таксама, як і ў Менску. Гэта было пры канцы 1988 году й прадвесьнем 1989 году. Спачатку быў створаны “Мартыралог Беларусі”, а па нейкім часе й аргкамітэт Бабруйскай суполкі Беларускага Народнага Фронту.

Першымі адраджэнцамі й стваральнікамі аргкамітэту ў Бабруйску былі Міхась Вярбоўскі, Ніна Якімава, Віктар Шамянкоў, Васіль Саковіч, Лявон Вашкевіч, Аркадзь Іосілеў, Аксеня Шамянкова. Шмат іншых сяброў далучыліся да дзейнасьці БНФ крыху пазьней.

Пачынаючы дзесьці з 1990 году пакрысе сталі гаварыць пра стварэньне палітычнай партыі. Тагачасная камуністычная вярхушка адмоўна ставілася да шматпартыйнасьці. Тым не менш у нашым горадзе пачалі ўзьнікаць суполкі ня толькі БНФ, але й Беларускай са-

цыял-дэмакратычнай грамады. Праўда, на пачатку 1991 году цяжка было стварыць суполку якой-небудзь партыі. Людзі ішлі ў БНФ, а вось гуртавацца ў палітычныя партыі ня вельмі імкнуліся.

Суполка Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады арганізавалася ў студзені 1991 году. Яе стваральнікамі былі Мікалай Вярынскі, Віктар Шамянкоў, Валянцін Жыдц, Іван Капусьцін, Вольга Дрозд ды інш.

## ЗЬ МЕМУАРАЎ

*Гражына Ліпіньска*

**Пра Вацлава Іваноўскага**

*Сыны Леанарда Іваноўскага, уласьніка шляхоцкага маёнтку Лябёдка (Шчучынскі р-н), спрычыніліся да адраджэньня трох суседзкіх народаў — беларускага, польскага й летувіскага. Найстарэйшы Ежы, інжынер па адукацыі, быў міністрам і сенатарам у адроджанай польскай дзяржаве, ваяваў супроць фашызму на Заходнім фронце. Вацлаў (7.6.1880—7.12.1943), хімік, прафэсар Варшаўскай палітэхнікі, з студэнцкіх гадоў улучыўся ў беларускае Адраджэньне. Тадэвуш (16.12.1882—1.6.1970), заолаг, працаваў на ніве летувіскай навукі, быў прафэсарам Ковенскага ўнівэрсытэта, акадэмікам Акадэміі навук Летувы. Наймалодшы, Станіслаў, стаў віленскім адвакатам і паводле свайго мэнталітэту належаў хутчэй да польскага народу. Як слушна адзначыў у сваіх успамінах «Wspomnienia z kresowej młodości» (Bydgoszcz, 1995) сын Станіслава Казімір, "такія дзіўныя сямейныя сітуацыі не былі рэдкасьцю на тэрыторыі колішняга Княства Літоўскага". І яшчэ варта ўспомніць, што менавіта з сваімі братамі Вацлаў друкаваў у Лябёдцы першую ў XX стагоддзі беларускую нелегальную газэту «Свабода», і што сыны таго ж Вацлава загінулі на барыкадах Варшавы ўвосень 1944 году... Падаем урывак з кнігі Гражыны Ліпіньскай "Jeśli zapomnę o nich…" (Warszawa, 1990) пра Вацлава Іваноўскага.*

Менскія палякі маюць іншы, чым карэнныя палякі, погляд на здраду й здраднікаў. Напрыклад, вялікай папулярнасьцю сярод іх карыстаецца кіраўнік Менскай Управы — "Herr Burgermeister", як яго называюць немцы, — прыбылы з Варшавы прафэсар Варшаўскай Палітэхнікі Вацлаў Іваноўскі. У міжваенныя гады студэнцкая моладзь вельмі любіла яго за тое, што быў просты, зычлівы, гатовы заўсёды прыйсьці кожнаму на дапамогу. Па-за Палітэхнікай я сутыкнулася зь ім яшчэ за два гады да вайны, калі прыехала ў Горадню з Варшавы ў справе пераносных сушыльняў для грыбоў, якія тамтэйшая Агародніцкая школа праектавала выкарыстоўваць у Беларусі. Прафэсар быў вынаходнікам такой пераноснай сушыльні. У размове зь ім заўважыла, што яго цікавіла не столькі гэтая прыстасова, колькі дабро беларускага народу. Ён высока ацаніў тое, што дзеля працы ў Горадні я пакінула Варшаву. Растлумачыў, як мы павінны берагчы шматвяковую беларускую культуру, любіць, навучаць і арганізоўваць мясцовы люд, каб узбагаціць яго духоўна й матэрыяльна. Цяпер нядаўнія слухачы й калегі прафэсара Іваноўскага лічаць яго здраднікам, плямай Варшаўскай Палітэхнікі, а ў Лёндане яго, бадай, прысудзілі да сьмерці. У мяне ягонае пранямецкае становішча таксама выклікала тады страх і агіду...

У дзьвярах зьяўляецца Іваноўскі:

— Ласкава прашу Вас, спадарыня, — кажа па-беларуску.

Я ў ягоным кабінеце і, брыдзячыся сваёй ролі, мармычу нейкія словы прывітаньня й ветлівасьці не то парасейску, не то па-нямецку. Іваноўскі неміласэрна крывіцца:

— О Божа, што думаюць пра мяне мае студэнты? — А потым, з дрыготкай просьбай у голасе. — Прашу, гаварыце па-польску. Мы тут адны.

Іваноўскі адгадвае мае думкі:

— Расея й Германія, — тлумачыць, — не пераносяць Божых справаў. Калі пані паглыбіцца ў сутнасьць Гарадзельскай вуніі, то зразумее, чаму пачутая на гэтай зямлі польская мова даводзіць нашых ворагаў да шаленства.

Ня ведаю, што казаць, а найперш — што думаць. Зноў Гарадзельская вунія, "польска-беларуская Песьня Песьняў". Насупраць мяне вісіць партрэт Гітлера, меней чым год таму вісеў тут партрэт Сталіна. Сяджу напружаная, недаверлівая, пільная. Іваноўскі глядзіць на мяне ўважліва й праз хвіліну кажа свабодна, прыязна, як даўней.

— Пані Гражына! Давайце дамовімся: я ня буду пытацца, чаго вы сюды прыехалі, але заўсёды дапамагу. Хоць бы таму, што пані для мяне частка Варшаўскай Палітэхнікі. Згода?

— Згода.

— Але з свайго боку мушу растлумачыць сваёй былой студэнтцы, дзеля чаго я тут. Ці гатова пані выслухаць і ўзважыць?

— Выслухаю й ўзважу.

— Такія, як я, што любяць адначасова Беларусь і

Польшчу й ведаюць, што Германія пойдзе адсюль праз 2–3 гады назаўсёды, выкарыстоўваюць часовую нямецкую акупацыю, каб выкараняць русіфікацыю й маральнае раскладаньне, якія Расея 150 гадоў несла сюды прымусам. Злачынствам перад беларускім народам і ягонай гісторыяй было б не выкарыстаць гэтыя пару гадоў.

Пра гутарку з Іваноўскім расказваю "Бярнарду".

— Найважнейшае тое, — даводзіць Буткевіч, — што дзеці ў беларускіх школах вучацца цяпер праўды пра Расею...

Іду ў Беларускую Управу, каб ад праф. Іваноўскага выцягнуць якую дапамогу для той сям'і (колішняга вартаўніка дому Ваньковічаў — *М.Ч.*). Праф. Іваноўскі адсылае мяне да Баляслава Берута, пазьнейшага прэзідэнта ПНР, які займаў тады ў Беларускай Управе высокую пасаду кіраўніка аддзелу забесьпячэньня на ўсю Беларусь.

— Гэта паляк, які выдае тут сябе за беларуса. Антыпатычны суб'ект. Зь ім трэба асьцярожней, — папярэджвае мяне Іваноўскі...

Праф. Іваноўскі не забываецца пра мяне:

— Немцы загадалі Беларускай Управе зьбіраць каляровыя металы. Зраблю вас кіраўніком гэтае справы. Праца ня вельмі важная, але "аўсвайс" (пропуск — *М.Ч.*) вельмі выгодны, — прапануе мне прафэсар...

Для запісу тых, хто здае каляровыя металы, немцы выдзелілі асобны журнал з графамі: імя, прозьвішча, адрас, від металу, вага. Апошнія дзьве рубрыкі запаўняю дакладна. А прозьвішчы й адрасы наўмысна перакручваю, каб ніхто непажаданы не натрапіў на гэтых наіўных людзей. Уражваюць мяне й вялікі лік ахвярадаўцаў, і тое, што яны не баяцца падаваць свае прозьвішчы, і вера, што Расея сюды ўжо ня вернецца, і ўрэшце апантаная нянавісьць да бальшавікоў...

Наведвае мяне праф. Іваноўскі. Усьміхаецца, бачачы мае запісы.

— Дзякуй, што пані апярэдзіла маю просьбу. Для таго сюды й прыйшоў. Журнал вернецца немцам, а яны могуць прадаць гэтыя сьпісы Расеі.

— Даводзіцца тут чуць гісторыі зь мінулых дваццаці гадоў.

— Я такое чую штодня ад тысяч людзей ня толькі зь Менску й цэлай Усходняй Беларусі, але таксама ад уцекачоў з Украіны й Заходняй Расеі, — адкрываецца мне прафэсар, — раблю нататкі. Калі дажыву, апрацую й выдам.

Нажаль — не дажыў...

Пашыралася савецкая дывэрсія. Але пакуль удары скіраваныя ня супраць немцаў, а толькі супраць беларускіх дзеячоў і цывільнага насельніцтва. Загінулі ад стрэлаў некалькі высокапастаўленых беларусаў, між іх — рэдактар Казлоўскі. Выбухнула ў Беларускім тэатры міна. Ахвярамі сталіся цывільныя грамадзяне, сярод іх сын палкоўніка Кушаля (і Натальлі Арсеньневай — *М.Ч.*). На трэйці дзень адбылося ўрачыстае пахаваньне забітых. Нямецкая ўлада ня надта пільна шукала выканаўцаў гэтае акцыі...

У сьнежні 1943 году ахвярай замаху стаўся й праф. Вацлаў Іваноўскі. Ехаў раніцою на вазку, на прыступку ўскочылі двое мужчын і, некалькі разоў стрэліўшы, зьбеглі. Вазьніца пагнаў коней і прывёз непрытомнага ўжо прафэсара ў шпіталь. Нямецкія ўлады хацелі, каб пахаваньне забітага асьвяціў летувіскі капелян, але кс. Ігнатовіч, слушна ці ня слушна, выкручваецца, патлумачыўшы, што колькі гадоў таму Іваноўскі браў другі шлюб у праваслаўнай царкве. Немцы выкарыстоўваюць гэты момант і наладжваюць бургамістру Менска праваслаўнае пахаваньне з усёй вайсковай і царкоўнай помпай. Каталікі шкадуюць, што праз кс. Ігнатовіча цырымонія пахаваньня папулярнага й шаноўнага чалавека трапіла ў рукі немцаў і папоў...

Зноў гутару з дэлегатам Ураду Я. Янкоўскім пра беларускія справы, знаёмлю яго з актуальнай дзейнасьцю грамадзкіх, адміністрацыйных і парамілітарных — нібыта пранямецкіх — інстытуцый. Дзялюся сваім меркаваньнем, што моцна закансьпіраваная Беларуская Незалежніцкая Партыя выступіць у вызначальны для Краю момант. Янкоўскі адгукаецца:

— Вельмі шкада праф. Іваноўскага. Ня здолелі мы перашкодзіць...

— Як гэта, "ня здолелі" ?! — нейкае балючае падазрэньне закрадаецца ў мае думкі. — Хіба палякі?..

— Не! Катэгарычна не! — пярэчыць Янкоўскі.

Але гэтае падазрэньне будзе мяне трывожыць некалькі гадоў, пакуль не пачую ў лягеры "Озерлаг" у Сібіры ўспаміны Алы Навумавай, былой савецкай партызанкі. Яе нарачоны, партызан з таго ж аддзелу, атрымаў заданьне ліквідаваць праф. Іваноўскага. Вярнуўшыся з напарнікам у лес, ён маляўніча расказваў таварышам пра забойства Іваноўскага й свае ўцёкі зь Менску...

---

*Ліпіньска Гражына (канспірацыйная мянушка "Данута") — актыўная ўдзельніца польскага антысавецкага й антынямецкага падземнага руху ў Беларусі (1939—1944 гг.), ад 1942 г. — кіраўніца польскай выведкі ў Менску. Увосень 1944 г. арыштаваная органамі НКВД і засуджаная на доўгатэрміновае зьняволеньне. У 1956 г. вярнулася ў Польшчу й жыла ў Варшаве. Напісала грунтоўную й вельмі інфармацыйную кніжку ўспамінаў на 462 старонкі. Больш за палову яе прысьвечана падзеям у Беларусі, да якой аўтарка ставілася з выразнай зычлівасьцю.

"Бярнард" — Вітаўт Буткевіч, народзінец Ліды, адзін з кіраўнікоў польскага падзем'я ў Менску, кіраўнік фінансавага аддзелу Беларускай (Менскай гарадзкой) управы, удзельнік Варшаўскага паўстаньня 1944 г. Гражына Ліпіньска ў сваіх успамінах характарызуе В.Буткевіча, яго бацькоў і блізкіх як шчырых беларускіх патрыётаў.

Янкоўскі Ян — прадстаўнік польскага эміграцыйнага ўраду, які тым часам знаходзіўся ў Лёндане.

*Пераклаў і падрыхтаваў да друку*
*М. Чарняўскі*

*Аляксандар Амельяновіч*

## Радзіма ў сэрцы з маленства

*9 верасьня 2002 году на 74-м годзе жыцьця памёр колішні сябар Саюзу Беларускіх Патрыётаў, палітвязень сталінскіх канцлягераў Аляксандар Амельяновіч (30.9.1928—9.9.2002). Пахаваны на могілках у Вялейцы. Падаем урывак зь ягоных успамінаў.*

Беларускай мове й пісьму я навучыўся нават раней, чым польскай. У нас па суседстве жыў Антон Сямёнавіч Малевіч. Даволі вядомы чалавек. Ён быў настаўнікам. Калісьці закончыў Віленскую беларускую гімназію, але з тае прычыны, што не згаджаўся вучыць беларускіх дзяцей на польскай мове, яго проста пазбавілі працы настаўніка. І ў далейшым ён апынуўся ў падполлі. Часта прыходзіў да нас, вельмі любіў дзяцей. І вось, калі я быў яшчэ ў дзіцячым узросце, ён падарыў мне першую кніжку, якую ўсё жыцьцё памятаю: "Першыя зярняткі", на беларускай мове. Прыносіў таксама выразкі з газэты, што друкавалася, верагодна, яшчэ ў нашаніўскую пару, "Новую зямлю" Якуба Коласа... Вось так у маёй душы зь дзіцячых гадоў зарадзілася беларускасьць...

Экзамены я здаў пасьпяхова і ўвосень 1943 году мяне залічылі на першы курс Пастаўскай настаўніцкай сэмінарыі. У сэмінарыі не было ніякіх апрацовак для ўступленьня ў Саюз беларускай моладзі, проста залічвалі. Цяпер часам кажуць, што ў СБМ не выхоўвалі беларускасьць, а апрацоўвалі ў фашыстоўскім кірунку. Гэта ня так. У тым узросце, а мне тады было 15 гадоў, мы гэтага ня ведалі. Каб нехта прыязджаў зь нямецкага боку — такога не было. Былі свае настаўнікі. У нас класным кіраўніком быў Грэскі. А дырэктар сэмінарыі быў Шчасны. Вядома, дырэктар ёсьць дырэктар... Ён вёў грамадазнаўства, і больш я зь ім ня меў справаў. А самымі блізкімі настаўнікамі былі Сяргей Мацук, які выкладаў фізыку, Хатэнка, Навіцкая. Беларускай мове вучыў *Арловіч <невыразна>*. Гэта быў эрудзіраваны, адукаваны настаўнік, ён на чыстай, прыгожай мове вёў у нас літаратуру й граматыку. Першы курс я скончыў якраз перад вызваленьнем Паставаў ад немцаў. Вялікіх баёў за Паставы не было — проста немцы пайшлі, а на досьвітку зьявіліся савецкія салдаты.

Пасьля вызваленьня вярнуўся дамоў. У сэмінарыі са мною быў Мікалай Церашкевіч з вёскі Зыкава, былі й дзяўчаты — Гілена Амельяновіч, Зося Бярняк. І вось праз іх я даведаўся, што зьбіраюць студэнтаў, якія займаліся ў сэмінарыі, і на гэтай базе будзе арганізаванае пэдвучылішча. Я неўзабаве таксама паехаў у Паставы. Дырэктарам пэдвучылішча быў Паныш Антон Станіслававіч. Памятаю, як цяпер, — яшчэ ў вайсковай форме, у шынелку, керзавых ботах, даволі такі прыветлівы чалавек. Я паказаў яму пасьведчаньне, якое выдалі па заканчэньні першага курса сэмінарыі. Ён сказаў: "Добра, залічым цябе на другі курс пэдвучылішча". Была невялічкае гутарка. Праверыў мае веды па матэматыцы, па фізыцы й сказаў, што падыходжу. Без усякіх экзамэнаў мяне залічылі на другі курс. Заняткі вяліся на расейскай мове — настаўнікі былі з усходу.

Класным кіраўніком была настаўніца Мар'я Вікенцеўна Ясюнас, якую мы вельмі любілі. Яна ж займала пасаду й завуча. Былі ў нас настаўнікамі й кантужаныя, напрыклад Селіванчык, ён вёў расейскую літаратуру. Запомніліся яго вельмі цікавыя ўрокі. Беларускую мову выкладала Сяргеева, даволі маладая жанчына. Быў і шэраг іншых настаўнікаў, якія нас і давялі да сканчэньня пэдвучылішча ў 1946 годзе. Я атрымаў дыплём і накіраваньне ў Мядзельскі раён.

Загадчык Мядзельскага РАНА Рублеўскі сказаў, што накіроўвае мяне ў Сваткаўскую сярэднюю школу, на той час там было яшчэ толькі 7 класаў. А я не лічыў сябе дастаткова падрыхтаваным і імкнуўся далей працягваць вучобу. Зьездзіў у Менск. Першае ўражаньне — на фанеры ўбачыў плакат: "З руін і папялішчаў адновім мы цябе, наш родны Мінск!". Гэта было каля вакзала. Частка ўнівэрсытэцкага гарадка захавалася цэлай. Зайшоў я ва ўнівэрсытэцкі вэстыбюль, у прыймальню. Рэктарам быў, здаецца, Фёдараў. І я зьвярнуўся да яго. У той час было прасьцей, чым цяпер, бо людзей, што жадалі вучыцца, было ня так шмат. Ён мною зацікавіўся. Пагледзеў дыплём пэдвучылішча — сьвежыя веды. Але, кажа, няма інтэрната, каб жыць. Папытаўся, ці ня маю тут каго з сваякоў. А хто ж у мяне тут можа быць, тым болей што Менск разбураны. Тады рэктар прапанаваў: "Паколькі ты ўжо працуеш (а я на той час ужо атрымліваў неблагую зарплату — 1200 рублёў), падумай — у нас адчыняецца завочнае аддзяленьне. Калі ласка, прыязджай пасьля Новага году, паступіш, будзеш і вучыцца, і працаваць. А потым, калі захочаш, пяройдзеш на стацыянар". Я пагадзіўся. Да таго ж Менск зрабіў на мяне цяжкое ўражаньне — усё дыміцца, закурэлы Дом ураду, і ня бачна ніякіх зрухаў. Справа была пад вечар, а начаваць не было дзе. Тады ніякіх пасажырскіх цягнікоў не было, дык я прычапіўся да буфераў таварняка — зваўся "Пяцьсот вясёлых" — і гэтак даехаў да Княгініна. І застаўся працаваць у Сваткаўскай школе. Дырэктарам быў там Пракаповіч Пётр Мікалаевіч.

Выкладаў я ў Сватках матэматыку, фізыку, нямецкую мову, фізкультуру... Ну, і так пайшла нядрэнна ў мяне справа. Падабалася мне школа. Тым больш — Пількаўшчына побач, радзіма нашага паэта Максіма Танка. Мясцовасьць цудоўная: бор, лес, здаровае паветра. А вучні былі намнога старэйшыя за мяне.

І вось 23 лютага 1947 году я правёў ранішнік, прысьвечаны дню савецкай арміі, 24 і 25 таксама заняткі праводзіў. Прыйшоў увечары дахаты, падрыхтаваўся да заўтрашніх урокаў, лёг спаць, а на досьвітку пачуў стук у вокны. Гаспадар мой, Роўда, ускочыў, адчыніў дзьве-

ры. Пасьля вярнуўся й кажа мне, што пыталіся, ці я тут жыву, і пайшлі. Хто пытаўся, не прыкмеціў.

Раніцою я пайшоў на ўрокі. Першым урокам у мяне была матэматыка ў шостым класе. Пачаў заняткі, правяраю хатняе заданьне. І раптам адчыняюцца дзьверы й ўваходзіць дырэктар... Я адразу зразумеў, што нешта здарылася. Бо ў чалавека быў белы твар і дрыжэлі рукі. Ня мог вымавіць майго імя й прозьвішча. Я зразумеў толькі, што мне трэба выйсьці. Выходжу й бачу двух аўтаматчыкаў і капітана. На мяне адразу накінуліся й надзелі кайданкі. Тут якраз зайшла настаўніца Вольга Мікалаеўна. Ну, і без усякіх размоваў павялі на кватэру. Гаспадар, а ў іх хлопчык быў маленькі, таксама перапалохаўся. Ну, яны для прыліку пачалі ператрус, сказаўшы: “Нам докладывают, что у тебя есть оружие”. Я кажу, што зброю ніколі ў руках не трымаў, і паняцьця пра яе ня маю. У арміі я таксама яшчэ не служыў. “Ну, не важно, идем в Сватки. Только теплее одевайся”. У Сватках будынак школы быў спалены, таму заняткі праводзіліся ў Замашшы, дзе вучыліся па хатах. Прыйшлі ў сельсавет. Тут мяне затрымалі крыху, перамовіліся з старшынёй, і той даў фурманку. А сьнег паваліў такі густы-густы, было гэта 26 лютага. І павезьлі мяне на станцыю ў Княгінін. Пасадзілі ў цягнік. Але не гавораць, куды вязуць, за што затрымалі. Тут выявілася, што гэты нарад вайскоўцаў з вялейскай часьці. Значыць, вязуць у Вялейку. Там завялі ў тамбур нейкага дома, здаецца, дзесьці па Стаханаўскай вуліцы. Даволі жорстка ставіўся да мяне той капітан, звалі яго Кісялёў: “Вот ложись в угол и отдыхай”. А мароз быў даволі вялікі. Нада мною, навёўшы аўтаматы, стаяць вартавыя. Жанчына-гаспадыня была сардэчная й прынесла мне, як цяпер памятаю, міску цёплых локшын. Паеш, кажа, сынку. Я паеў, бо сьнедаў жа толькі ўранку, а быў ужо позьні вечар.

Наступнай раніцай, гадзіны ў чатыры, капітан зноў мяне падняў і зноў павёў на станцыю. Селі ў цягнік і паехалі ў адваротным кірунку. І нічога мне ня кажуць: куды, за што, чаму? Дзесьці ўжо ўдзень прыехалі ў Глыбокае. А там зноў перасадка, на Паставы. У Паставах мяне замкнулі ў склепе плябані (пры мясцовым касьцёле), дзе захоўвалася бульба й гародніна. Там трымалі гадзін шэсьць, а потым выклікалі на допыт. За сталом сядзелі трое — маёр і два лейтэнанты.

Адразу задалі пытаньне: “В какой антисоветской организации состоял?” Я адказаў, што вучыўся за немцамі ў сэмінарыі й што была ў нас арганізацыя СБМ.

— Да что ты?.. — І пайшлі нецэнзурныя словы. Адзін схапіў ад печкі палена й пачаў біць мяне па плячах. — Признавайся, что ты антисоветчик!

А ў чым мне прызнавацца? Сувязяў з Паставамі ў мяне не было ад 46-га году. Я нікога ня знаў і не бачыў. А што за арганізацыя Саюз Беларускіх Патрыётаў, я цьмяна ўяўляў, бо на сходах быў толькі два разы. Ды якія сходы? Гэта была перад выпускам такая сустрэча разьвітальная. Як зараз высьветлілася — хлопцы прымалі й прысягу. А што была за прычына?.. Безумоўна, я ж ня быў супраціўнікам, каб навучаньне ў пэдвучылішчы было на нашай мове. Гэта цяпер я даведаўся, што было патрабаваньне ад настаўнікаў выкладаць на беларускай мове. І пра адраджэньне Беларусі нашай вяліся размовы. Але я ня быў знаёмы з кіраўнікамі. Аднаго я толькі ведаў, Асіненку.

І вось яны пачынаюць у мяне дабівацца: як гэта было, што, дзе, хто цябе завербаваў? А калі мы сустракаліся перад разьвітаньнем у пэдвучылішчы, быў зроблены фотаздымак, які захаваўся й затым стаў “вещественным доказательством”, што гэта сябры СБП. Але практычна у гэтай арганізацыі — зараз гэта ўжо справа мінулая й я не магу крывіць душою — я ня браў удзелу, не прымаў прысягі й ня быў абазнаны ў яе плянах. Гэта я даводзіў на сьледзтве, але мяне й слухаць ня сталі. Ня ведаў я й пра глыбоцкую арганізацыю, калі й якія там прыязджалі хлопцы.

Пасьля такой апрацоўкі, у тым ліку й паленам, мне стала балюча й крыўдна. Зноў мяне ўкінулі у той жа склеп. Праседзеў там да досьвітку, а ўранку зноў павялі на вакзал і павезьлі ў кірунку Вільні. У Вільні перасадка. Прывезьлі ў Горадню, у турму на вуліцы Ажэшкі. Кінулі ў камэру сярод масы зьняволеных. Былі там і бытавікі, і нейкія сяляне. І адразу перада мною на падлогу кінулі белы ручнік. Потым даведаўся, што гэта першая сустрэча арыштанта, каб пазнаць — бывалы я чалавек ці не. Я адразу ўбок. Зразумела, навічок... А ў камэры было даволі шмат людзей, гарачыня, ажно ўсе спацелыя. Падыходзіць да мяне адзін: “Ну, што ты за пацан? Адкуль?”. Я адказаў, што еду з Паставаў. А хто я — яшчэ невядома, і куды вязуць — таксама ня ведаю.

Мне далі месца легчы на падлозе. Папыталіся, ці не галодны. А я з учарашняга дня ня еўшы. Тут яны пастукалі, прыйшоў дзяжурны. Кажа, трэба чакаць да абеду, тады выдадзім. Пад вечар выклікаюць: “На выход с вещами!”. Выйшаў. Бачу — зноў ахоўнікі. Вывелі мяне з гэтай турмы і — на вакзал. Там пасадзілі ў вагон і павезьлі на Менск.

На наступны дзень дзесьці раніцай зьмясьцілі мяне ў нейкую вежу. Як пазьней мне стала вядома, гэта была “амэрыканка”. Завялі ў камэру нумар 27, а там ужо сядзеў хлопец. Гэта не ў самой вежы, а ў прыбудове (потым даведаўся, што яе дабудоўвалі немцы).

З размовы з гэтым хлопцам я высьветліў, што ён з Глыбокага, і таксама быў сябрам Саюзу Беларускіх Патрыётаў. Прозьвішча яго Мядзелец. Вось мы й сядзелі зь ім у гэтай камэры. Адсюль нас вадзілі на сьледзтва.

Першым сьледчым у мяне быў Лысенка, ужо сталы мужчына. Даволі такі неблагі чалавек. Ён паставіўся да мяне вельмі ветліва і, распытаўшы, сказаў: “Ну цяпер, хлопча, табе давядзецца шмат пацярпець гора, перажыць усяго. Але хто яго ведае, як жыцьцё складзец-

ца? Ты яшчэ малады. Магу табе толькі параіць: будзь заўсёды чалавекам. Дзе б ты ні быў. Я многа працаваў у лягернай сістэме, быў на аддаленых участках, дзе зьняволеныя адбываюць свой тэрмін. Там трапіш у такое асяродзьдзе, дзе можа быць усялякая подласьць. Але ты будзь усюды на сваім месцы, дзе б ты ні знаходзіўся, вядзі сваю работу, працуй, а як складзецца далейшы лёс — само жыцьцё пакажа”.

Вось гэтыя словы мне запомніліся надоўга.

Ён і не сказаў, што ў мяне будзе другі сьледчы. А назаўтра, калі выклікалі, прыйшоў яшчэ даволі малады хлопец, званьне ў яго было, здаецца, лейтэнант. Проці свайго папярэдніка ён быў даволі грубы чалавек. Нецэнзурныя словы ў яго праскоквалі праз адно, і ўся размова была: “Давай не крути, рассказывай!”

Я адпавядаю, што ўсё ўжо расказаў. Што болей пра гэтую арганізацыю нічога ня ведаю, бо быў у іх толькі аднаго разу перад сканчэньнем пэдвучылішча. Што потым паехаў у далёкую вёску Сваткі, і пасьля гэтага ў Паставах ніколі ня быў і зь сябрамі па вучобе не сустракаўся. Што апынуўся зусім у іншым асяродзьдзі, сярод іншых людзей, і нічога да сказанага не магу болей дадаць.

Ён паглядзеў на мяне й кажа: “Я вучуся на юрыдычным факультэце й мне трэба канспэкты пісаць. Давай я пасаджу цябе тварам да калідора й прачыню дзьверы. Калі ўбачыш, што нехта старшы ідзе сюды, падасі мне знак — тупнеш нагою ці яшчэ што...” І вось як толькі хто накіроўваўся ў наш бок, ён грукаў па стале кулаком і крычаў: “Давай, расказывай!”

Так ён вёў сьледзтва дзесьці да месяца мая. Потым справа дайшла да канца, падпісалі гэты вядомы 242-гі артыкул, здаецца, нават быў пункт “б”. І мы пачалі чакаць суда.

Ад Мядзельца я больш падрабязна азнаёміўся з гэтай арганізацыяй, а пастаўскіх хлопцаў я ўжо ведаў. Але чаму мне раней не казалі пра гэтую арганізацыю, да гэтага часу заставалася загадкай. Можа таму, што быў я старастам групы, можа, пабойваліся?

На той фатаграфіі я быў, і гэта было самае страшнае “вещественное доказательство”. Тут я ўжо нічога ня мог ні давесьці, ні зьняпраўдзіць. Я памятаю гэты фотаздымак. Сьледчы паказвае яго мне, а там усе пранумараваныя, усе сябры гэтай арганізацыі. Ну, я ўжо й зьмірыўся з гэтым.

У гэтага сьледчага Гаршкова адна заслуга, што ён спачувальна паставіўся да мяне. “Я магу, — кажа, — напісаць, хоць і ня маю права, што членам арганізацыі ты быў, але прысягі прыняць не пасьпеў. Можа гэта табе калі й спатрэбіцца”.

Вось на гэтым мы са сьледчым і разьвіталіся.

А потым быў суд. Памятаю, будынак быў даволі вялікі... Калі гналі па вуліцы на гэты суд, я раптам пачуў дзявочы голас: “Алесь, Алесь, чаму ты тут?!” Хто гэта быў, да сёньняшняга дня ня ведаю. Можа, хто зь сябровак з пэдвучылішча?..

Прысуд мне надоўга застаўся ў памяці. Старшыняваў на судзе Фіклуша, другі суддзя быў Разанаў, а трэцяга ня памятаю. Калі чыталі пастанову, у гэтага чалавека трэсьліся рукі. Мне, як і большасьці, далі 10 гадоў “исправительно-трудовых лагерей” з паражэньнем правоў на 5 гадоў і затым 5 гадоў высылкі. ...

*Запісаў Міхась Чарняўскі ў 1997 годзе ў Вялейцы*

*Андрэй Вайтовіч*

## Згадкі пра вядомых патрыётаў

*Андрэй Вайтовіч — гэта шчыры беларускі патрыёт, ветэран нацыянальнага руху. Чалавек, які ахвяраваў сваю маладосьць дзеля дабра й волі Бацькаўшчыны. Нарадзіўся ён ў 1920 годзе ў вёсцы Залозкі каля Любчы (Навагрудчына) ў сялянскай сям'і. Юнаком цягнуўся да навукі, але сям'я ня мела на гэта грошай. Тым ня менш з дапамогай знаёмых вучыўся на Навагрудчыне, у Вільні. Пад час нямецкай акупацыі — навучэнец Навагрудскай настаўніцкай сэмінарыі, адначасова ўдзельнік нацыянальнага падпольнага руху, сябар нелегальнай Беларускай незалежніцкай партыі, жаўнер Беларускай краёвай абароны. У верасьні 1944 году Вайтовіч быў арыштаваны савецкай дзяржбясьпекай і ў наступным годзе засуджаны на 8 гадоў канцлягераў. Пакараньне адбываў у Казахстане й Сібіры. У Беларусь вярнуўся ў 1958 годзе, працаваў будаўніком, сябраваў з паэткай Ларысай Геніюш. Жыве ў Слоніме. У гэтым нумары падаем ягоныя ўспаміны пра вядомых беларускіх патрыётаў Алену Сакалову-Лекант і Васіля Рагулю.*

### *Васіль Рагуля*

Васіль Рагуля быў гарачым патрыётам Айчыны. Пры Польшчы яго абралі сэнатарам у Сойм, дзе ён бараніў правы беларусаў. За «першымі саветамі» працаваў настаўнікам у беларускай сярэдняй школе ў Любчы. Разам зь ім настаўнічаў ягоны пляменьнік Барыс, але таго неўзабаве арыштавалі. Васіль Рагуля таксама трапіў у бальшавіцкую турму як «вораг народу». У зьняволеньні заспеў яго пачатак вайны паміж Нямеччынай і Савецкім Саюзам.

Частку вязьняў энкавэдысты адправілі таварным цягніком на ўсход. У іх лік трапіў і Васіль Рагуля. Але далёка ад'ехацца не пасьпелі — трапілі пад нямецкую бамбёжку. Скарыстаўшы з таго, што ахова разьбеглася, вязьні зь цягніка паўцякалі. Рагуля пайшоў на захад, дахаты, але ня меў з сабою ніякіх дакумэнтаў. На Магілеўшчыне, на ўскраіне нейкае вёскі, яго затрымалі энкавэдыс-

ты, што ўцякалі ад немцаў: «Эй ты, шпион, иди сюда! К немцам идешь? Сейчас выведем за деревню и “щелканем”!» І пагналі перад сабою…

Ды неспадзявана здарыўся сапраўдны цуд. У Любчы перад вайною дырэктарам школы быў малады хлопец з усходняй Беларусі, з Магілеўскай вобласьці. Калі пачалася вайна, ён, прыхапіўшы з сабою школьную пячатку, пасьпеў уцячы на ўсход і вярнуўся ў сваю родную вёску. І трэба было так стацца, што энкавэдысты гналі Рагулю якраз праз тую вёску! Былы дырэктар бачыць, што гоняць ягонага настаўніка. Калі параўняліся, ён павітаўся з Рагулем: “Здравствуйте, Василий Тимофеевич!” Той падымае на яго вочы: “Здравствуйте, здравствуйте…” Канвой пытаецца: “Что, ты знаешь его?” ”Да, это наш учитель”, — адказаў былы дырэктар Любчанскай школы. Гэта й выратавала Рагулю. Энкавэдысты брудна вылаяліся й адпусьцілі яго.

А той чалавек напісаў Васілю Цімафеевічу нейкую даведку, паставіў на яе школьную пячатку ды пажадаў шчасьлівай дарогі. З гэтым дакумэнтам Рагуля й вярнуўся ў родныя мясьціны.

### *Алена Сакалова-Лекант*

У Віленскай беларускай гімназіі працавала настаўніцай Алена Сакалова-Лекант. У яе быў сын Анатоль. Пад час нямецкай акупацыі ён быў у Беларускай краёвай абароне ў Менску. У 1944 годзе, калі адступалі на Захад, ён сьпецыяльна заехаў да маці ў Вільню: “Мама, паедзем!” А ёй ехаць не хацелася, бо думала, што будзе сыну лішнім клопатам. Усё ж згадзілася: “Ну, добра, паедзем”.

Сабралі рэчы, і Анатоль завёз маці на вакзал, сам жа паехаў у сваю вайсковую часьціну. А яна ўзяла тыя валізкі й вярнулася дахаты. Спадзявалася, што бальшавікі яе не зачэпяць. Яшчэ на пачатку вайны, калі летувісы нішчылі жыдоў у Вільні, яна падабрала дваіх дзяцей-жыдзянят і хавала іх усю нямецкую акупацыю. А як прыйшлі саветы, дала пра іх абвестку ў газэту, спадзеючыся, што знойдзецца нехта з родных. Адшукаўся бацька, капітан савецкай дзяржбясьпекі. Тым ня менш Алену Сакалову неўзабаве арыштавалі як “немецкую пособницу”. Яна была засуджаная на 5 гадоў зьняволеньня. І гэты капітан ня здолеў яе вызваліць…

Была яна ў лягеры на Суха-Бязводным, дзе апынуўся й я. Алена Кірылаўна, або, як мы яе звалі, цётка Алена, была старэнькая і яе не ганялі на цяжкія работы. Працавала яна прыбіральніцай у санчасьці, зьбірала аб’едкі й падкормлівала нас, маладых хлапцоў-беларусаў, “дахадзяг”… Ніколі гэтага не забуду. Я, напэўна, толькі дзякуючы ёй і выжыў там.

Аднаго разу мы разам з Сяргеем Крэмянеўскім, інжынерам-будаўніком зь Менску, намерыліся ўцячы зь лягеру. Думалі прабрацца за мяжу… Пра нашыя пляны я шчыра расказаў цётцы Алене. У нас часта былі такія шчырыя размовы. А яна ведала, што ўцячы практычна немагчыма. “Ну, добра, — кажа яна, — я памру, бо мне мала засталося… Ты пабяжыш… А там нашыя, за мяжою, стараюцца, каб сваім людзям памагчы. Ды як тут нікога ня стане, калі ты пабяжыш і я… На каго яны будуць спасылацца, выступаючы перад Англіяй, Амэрыкай? Нашая доля такая: перацярпець тыя мукі, якія нам наканаваныя”.

Пасьля яе адправілі на “трэці лагпункт” (інвалідны), дзе зьняволеныя больш займаліся гаспадарчымі работамі, напрыклад, садзілі бульбу. Аднойчы нас гналі з працы. Бачым, наперадзе стаіць жанчына. А нам нельга было ня тое што з шэрагу выйсьці, а нават галавы павярнуць. Гэта была цётка Алена. Яна падыйшла да начальніка канвою й просіць: “Гражданін начальнік, тут мой сынок, дазвольце мне яму хлеба кавалак перадаць…” Той быў, відаць, неблагім чалавекам. Спыніў калону, і яна аддала мне свой бохан хлеба, які ёй далі на вызваленьне…

Цётку Алену адпраўлялі на высылку, але не адправілі. Той капітан дзяржбясьпекі, дзяцей якога яна ўратавала, узяў яе пад сваю адказнасьць. Яна працавала санітаркай недзе каля Кіева. «Цяпер я ўжо хаджу “белай варонай”», — пісала яна мне адтуль.

У Вільні ў цёткі Алены была кватэра, і яе сяброўка, таксама Алена, захавала яе да таго часу, пакуль Сакалова не вярнулася. Там яна й дажывала свой век… Аднойчы захварэла, трапіла ў больніцу, дзе й памерла на трэці дзень… Кастусь Шышэя пісаў мне зь Вільні, што на яе пахаваньні было некалькі тысяч чалавек — беларусы, палякі, летувісы. Так яе ўсе паважалі.

*Запісаў Сяргей Ёрш*

## *Пятро Шырокаў*
## Савецкая Гальгота

*Гэты артыкул-успамін пра савецкія канцлягеры Пятро Шырокаў, больш вядомы пад паэтычным псэўданімам Тодар Лебяда, напісаў пад час нямецкай акупацыі. Ён быў ня толькі паэтам, але й драматургам. Нарадзіўся ў Віцебску ў 1914 годзе. У 1930-х гадох Шырокаў быў рэпрэсаваны савецкімі ўладамі, пакараньне адбываў на поўначы Расеі. У нямецкую акупацыю апынуўся ў Віцебску, друкаваў у мясцовай газэце “Беларуская старонка” свае лягерныя ўспаміны. Выдаў таксама кніжку вершаў “Песьні выгнаньня”, напісаў драму “Загубленае жыцьцё”, якая ў 1943 годзе была пастаўленая на сцэне Менскага гарадзкога тэатру. Выехаўшы ў 1944 годзе на Захад, пасьля заканчэньня вайны Пятро Шырокаў наважыўся вярнуцца на Бацькаўшчыну, дзе быў арыштаваны органамі савецкай дзяржбясьпекі. І зноў беларускі паэт пай-*

*шоў па этапах, засуджаны на 25 гадоў зьняволеньня. Памёр П.Шырокаў у 1970 годзе ў Расеі.*

*У гэтым нумары перадрукоўваем успаміны Тодара Лебяды-Шырокава зь віленскай газэты «Biełaruski hołas» за 29 кастрычніка 1943 году. Зазначым, што гэтую газэту рэдагаваў яшчэ адзін вязень савецкіх канцлягераў Францішак Аляховіч.*

…Шырокая й магутная рака Пячора. Нізкія глінястыя берагі валавянаю істужкаю аблямоўваюць яе; на іх пышна хістаецца змрочная тайга: махнатыя стагадовыя яліны, жоўтыя сосны, грубыя ў два ахопы лісьцьвеніцы — усе разам ствараюць грозную, нездабытую таемную сьцяну. Але чым далей на поўнач — тайга робіцца штораз ніжэйшай і ніжэйшай: дрэвы з магутных волатаў робяцца зныдзелымі, сухімі кусткамі і, урэшце, зусім раўнуюцца із балоцістай тундрай. Пачынаецца прастор вечнае мерзласьці. Справа, з паўночных склонаў Уральскіх гораў, шпарка зьбягае сьцюдзёная рака Уша й прылучаецца да Пячоры.

Па берагох пышнае ракі й яе прытоках: Іжме, Усе, Кожвівэ, Цільне, Шугору, раскіданы рэдкія, прыціснутыя да зямлі, шэрыя вёскі: іхныя жыхары — зыране.

Але ня толькі зыране насяляюць гэтую дзікую краіну: пачынаючы ад 1927—1928 гадоў сюды пачаў прыязджаць і іншы народ. Спачатку невялікімі групамі, а потым сотнямі, тысячамі й дзесяткамі тысяч. Гэта былі зьняволеныя: палітычныя й крымінальныя катаржнікі. Тайга, балота, зьвяры, камары, жамяра, зьняволеныя, чакістыя, калючы дрот. Гэты канцэнтрацыйны табар быў названы “Ухта-Пячорскім”. Арганізаваў яго, а наступна кіраваў яго як начальнік табару чакісты Якаў Майсеевіч Мароз.

На пачатку 1930 году на рацэ Ухта была знойдзена нафта, а ля Воркуця — вялізарныя паклады каменнага вугальля.

Савецкі ўрад пастанавіў пабудаваць чыгунку ад Котласу да Воркуты, даўжыні 1.500 клм. Усе буйныя пабудовы ў Савецкім Саюзе звычайна рабіліся рукамі зьняволеных. І на “Ухта-Пячорскую чыгуначную магістралю” з усіх канцоў краю пацяклі дзесяткі тысячаў зьняволеных. Якаў Мароз паклапаціўся стварыць ім гэткія жыцьцёвыя варункі, што нават жывёле цяжка было пражыць.

Я прыбыў у гэты табар, як палітычны зьняволены, на пачатку 1937 году, пасьля гадовага пабыту ў маскоўскім Бутырскім вастрозе, і за месяц перад пачаткам вайны, у траўні 1941 году, вызваліўся, быўшы ў зьняволеньні агулам пяць гадоў.

Сьмяротнасьць у табары была вялізарная, размах пабудовы — каласальны, і 200.000 катаржнікаў аказалася малавата. Дзеля «падмацаваньня» прыслалі палонных палякоў, — ізноў нястача працоўнае сілы.

Яша Мароз дамагаўся яшчэ папаўненьня. Крамлёўскі Кагановіч, што быў тады наркомам шляхоў спалучэньня, памог суродзічу й «выклапатаў» дазвол у Сталіна паслаць дзеля «падмацаваньня» вывезеных із «вызваленае заходняе Беларусі» беларусаў.

І пацяклі ў Пячоры цягнік за цягнікам нешчасьлівых, ні ў чым не вінаватых беларусаў. Я памятаю бясконцыя плятформы, на каторых усулежкі пад слатою вясновага сьнегу (гэта было ў траўні 1940 г.) ляжалі цэлыя сем’і з малымі дзецьмі. Начальнікі з НКВД прывозілі іх у тайгу й паказвалі месца да пасяленьня, выбіраючы ў бальшыні выпадкаў дзялянкі «яшчэ не асвоеныя», г. зн. здалёк ад зыранскіх вёсак і сёлаў, без усялякае помачы, самі, маючы толькі сякеру й пілу, дый тыя на 3-4 сям’і.

Як і зьняволеных, касілі іх хваробы, асабліва цынга.

Беларусы секлі навакол аселішча тайгу, ачышчаючы плошчу да пасеву. Але рабілі гэта толькі ўвечары, пасьля свае асноўнае працы, дзеля каторае іх сюды прыгналі — загатоўкі лесу для будовы. Як і ўсюды ў савецкай краіне, ім даваўся “план” загатовак, які яны ня ў сілах былі выканаць — праца аплочвалася па-жабрацку.

З болем сэрца глядзеў я на гэтых паўголых, вечна галодных дзяцей, зьяданых камарамі. І калі яны горка плакалі, просячы ў мяне нешта зьесьці, хацелася плакаць зь імі разам. Часта тая ці іншая, паміраючая з галаду сям’я прыходзіла да нашага, асочанага плотам табарнага пункту й клаліся ля табару на зямлю.

— Вазьмеце нас да зьняволеных, — прасілі яны ў варты, — там бадай паўлітра вады з мукою даюць удзень, а мы й тога ня бачым. Дзеці паміраюць, на літасьць Бога вазьмеце.

Варта кольбамі стрэльбаў разганяла іх.

Даведзены да скрайнай роспачы беларус, страціўшы ўсю сям’ю, імкнецца ўцячы з гэтае жудаснае, чужое яму зямлі. Але ён, так сама, як і мы, зьняволеныя, ня мае пашпарту. У першай вёсцы першы лепшы, ахвочы да чоўкасьці камсамолец затрымае яго й завядзе ў міліцыю.

Амаль у кажнай вёсцы можна прачытаць абвесткі, што… “Абвешчаны месячнік змаганьня з уцёкшымі ворагамі народу. Кажны, хто пастачыць жывога ці мёртвага ўцёкшага, атрымае ўзнагароду ў 40 рублёў”. Якому хаця зыраніну-паляўнічаму ладна карысьнейшым ёсьць, бадзяючыся па тайзе, страляць у людзей, чым вавёрак.

І вось прадстаўнік лепшага беларускага сялянства ляжыць на сырым, тхлоным мху тайгі з ладункам буйнай паляўнічай шрацiны ў грудзёх і выплёўваючы згусткі крыві, памірае пад выцьцё сьцюдзённага паўночнага ветру. Над ім уюцца мільёны камароў, што высмактаюць зь яго ўсю, ня высмактаную бальшавікамі кроў.

*Публікацыя Андрэя Краўцова*

*Тамара Мінкевіч*

## Правай рукой, або Пра Яўгена Куліка расказвае ягоная сястра

Мой брат старэйшы за мяне больш чым на шэсьць гадоў. Таму я мала што магу згадаць пра ягонае дзяцінства. Нешта ведаю з успамінаў сваіх родных, некалькі момантаў памятаю сама.

Калі пачалася вайна, Геніку (так — Геня, Генік, Генічак — звалі яго дома) не было й чатырох гадкоў. Дзіцячы сад быў на дачы, за Менскам. Мама з татам адразу ж паехалі туды. Але Геніка там не было, бо персанал дзіцячага саду пачаў ужо выводзіць дзяцей у горад, і ніхто не мог сказаць, дзе яны знаходзяцца. Урэшце Геніка ўдалося адшукаць. Як потым стала вядома, амаль усе астатнія дзеці, апрача тых, каго пасьпелі забраць бацькі, загінулі разам з выхавальніцамі, трапіўшы пад бамбёжку.

Генік пачаў маляваць у дзяцінстве, якое, на жаль, прыпала на ваенныя й паваенныя гады. Мая старэйшая сястра Галя расказвала, што ў вайну нашая сям’я жыла на рагу вуліц Камсамольскай і Інтэрнацыянальнай. У той кватэры былі вельмі шырокія, амаль як стол, падваконьнікі. Паперы тады не было дзе ўзяць, і Генік маляваў танкі, самалёты, розных казачных істотаў проста на фарбаваным падваконьніку, пакуль не размалёўваў увесь. А калі там ужо не заставалася вольнага месца, усё гэта выціралася, і можна было пачынаць нанова. Маляваў простым алоўкам, трымаючы яго ў левай руцэ, бо ад прыроды быў ляўшун. Як брат сам расказваў, каляровыя алоўкі яму нават сьніліся. Запаветная мара збылася, калі Геніку было гадоў 7–8. Каляровыя алоўкі падараваў яму наш стрыечны брат Іван, на той час ужо сталы чалавек. Падараваў з умоваю, што Генік будзе пісаць і маляваць правай рукою. Так і пайшло. Маляваў і пісаў ён правай, а нейкія гаспадарчыя справы яму зручней было рабіць левай.

У школьныя гады мой брат хадзіў у гурток маляваньня Палацу піянераў. З тым часам зьвязаны адзін выпадак, пра які я даведалася пазьней. Аднаго разу Генік захварэў на запаленьне лёгкіх і трапіў у шпіталь. З сабой узяў ён алоўкі ды альбом, і, пакуль ляжаў там, увесь гэты альбом і змаляваў. Калі, вярнуўшыся, паказаў яго кіраўніку гуртка Алегу Луцэвічу, той моўчкі адамкнуў сваю шафу, дастаў зь яе акварэльныя фарбы, пару пэндзлікаў і падараваў іх Геніку. А дзецям сказаў: “Вось глядзіце, што можа зрабіць нават хворы чалавек”. Фарбы й пэндзлі на той час былі вельмі каштоўным падарункам.

Памятаю, як мы з братам адпачывалі ў піянерскім летніку. Я была тады малая, мабыць, яшчэ нават не хадзіла ў школу, ці, можа, толькі скончыла першы клас. Ня ведаю, ці адпачываў раней у летніку Генік, а для мяне гэта было ўпершыню. Трэба было надоўга разлучыцца з мамай. Але ж ехала я з братам, і таму было ня так страшна. Быў у нас на дваіх адзін фанерны куфэрак з віслым замком і стаяў ён у Генікавым пакоі. Праз гэты пакой мы, дзяўчынкі з малодшага атраду, вымушаны былі хадзіць, бо жылі ў суседнім тупіковым памяшканьні. Таму з братам мы бачыліся вельмі часта. На жаль, не памятаю нейкіх асаблівых падрабязнасьцяў з таго адпачынку. Запомніўся толькі вусаты начальнік летніка, якога мы называлі Будзённым. Памятаю таксама, што тады ў летніку давалі гарохавую кашу. Дома ж мама варыла з гароху толькі суп.

А яшчэ — і сёньня гэта стаіць у маіх вачох — запомніла такую карціну. Генік вяртаецца з школы. Я ўжо бачу яго на пагорку: цераз плячо торба з падручнікамі, у рукох — разгорнутая кніга. Ідзе й чытае. Ідзе павольна. Потым зусім спыняецца. Відаць, натрапіў на штосьці вельмі цікавае. Пастаяў, пачытаў і пайшоў далей, не адрываючыся ад кнігі.

У дзяцінстве Генік быў худзенькім, кволым. Захаваліся яго школьныя фотаздымкі, адкуль відаць, што з хлопчыкаў ён самы маленькі. Але вучыўся брат вельмі добра. У пасьведчаньні аб заканчэньні сямі класаў толькі адзнакі “выдатна”. Мастацкую вучэльню скончыў з “чырвоным” дыплёмам. У Тэатральна-мастацкім інстытуце таксама вучыўся добра. І, мабыць, зноў атрымаў бы такі ж дыплём. Але нечакана, за некалькі месяцаў да заканчэньня інстытуту, на нашу сям’ю абрынулася бяда: цяжка захварэла мама й за некалькі дзён да абароны Генікам дыплёму памерла. Усё гэта трэба было перажыць...

Калі Генік рыхтаваўся да экзаменаў, то хадзіў па хаце й чытаў уголас. Відаць, так ён лепш запамінаў матэрыял. Месца ў пакоі было мала, і ён хадзіў вакол стала.

Прыгадваецца й такі выпадак. Думаю, што гэта здарылася, калі брат быў студэнтам вучэльні. Быў позьні вечар. Назаўтра ўранку яму трэба было здаваць нейкі вельмі вялікі, на цэлы аркуш ватману, рысунак — “чарцёж”. Амаль усё ўжо было зроблена. Бутэлечка з тушшу стаяла на гэтым жа аркушы, відаць таму, што ў нас было вельмі цесна. Хто там быў вінаваты, ня памятаю, але гэтая бутэлечка перакулілася, і туш вылілася на чарцёж. А часу, каб зрабіць новы, ужо не было. І тады Генік пачаў зразаць пляму лязом, ды зрабіў гэта так акуратна, што нічога й знаць не было. Назаўтра мы не маглі дачакацца, пакуль ён прыйдзе, перажывалі за яго. А ён прыйшоў вясёлы, задаволены: атрымаў “пяцёрку”.

Памятаю, у нас доўга не было тэлевізара. Ён каштаваў дорага, і магчымасьці купіць у нас не было. У 1959 годзе брат упершыню зрабіў ілюстрацыі да нейкай дзіцячай кніжкі й атрымаў за сваю працу ганарар. Як мне помніцца, тры тысячы рублёў. За гэтыя грошы ён купіў для нас самы лепшы тагачасны тэлевізар “Беларусь-4”,

з радыёпрыймальнікам і прайгравальнікам, — як тады называлі, камбайн, а таксама стабілізатар да яго. Вось было сьвята ў сям'і. Так усе радаваліся!

А яшчэ памятаю, як брат маляваў мяне. Жылі мы тады на Гвардзейскім завулку. Ня ведаю, колькі мне тады было гадоў, мабыць дзесяць–дванаццаць. Геніку трэба было намаляваць алейнымі фарбамі партрэт — такое было заданьне. Вельмі не хацелася сядзець у застылай позе, але мяне ўсё ж угаварылі. Накінулі на галаву сьветлую вязаную хустку з шлякам — такія тым часам насілі вясковыя й гарадзкія жанчыны. Хустку ня трэба было завязваць, і яе канцы я мусіла трымаць рукою пад падбародкам. Тады я не задумвалася, чаму менавіта такі партрэт намерыўся маляваць Генік. І толькі цяпер, пасталеўшы, я зразумела, што ўжо ў маладыя гады праявілася братавая манера рабіць усё сьціпла, строга, дасканала выверана, з густам, не дапускаць нічога лішняга, як гэта й атрымалася на тым партрэце. На жаль, партрэт не захаваўся. Менавіта цяпер мне асабліва шкада яго.



## Ветэраны Адраджэньня не зыходзяць у нябыт...

8 студзеня 2002 году ня стала Івана Карповіча, аднаго з заснавальнікаў грамадзкага аб'яднаньня "Ветэраны Адраджэньня", сябра Рады аб'яднаньня.

Іван Карповіч нарадзіўся 1 ліпеня 1936 году на Ляхаўшчыне ў вёсцы Зарытава. Пасьля школы скончыў Баранавіцкі настаўніцкі й Гарадзенскі пэдагагічны інстытуты. У войску, як і шмат хто зь беларусаў, служыў на ваенна-марскім флоце, на Балтыцы. Пасьля дэмабілізацыі ўсё сваё жыцьцё працаваў на Слонімшчыне — дырэктарам школы, намесьнікам дырэктара медычнай вучэльні. Вучыў моладзь, не шкадуючы ні сіл, ні здароўя. Таму й пасьля цяжкой хваробы апошнія гады працаваў настаўнікам у школе.

Пасьля выхаду на пэнсію Іван Карповіч стаў дырэктарам школьнага музэю СШ № 10 Слоніма, і яго плённымі намаганьнямі звычайны школьны музэй ператварыўся ў музэй горада. Да яго гарнулася й дапамагала яму ў стварэньні музэю вучнёўская моладзь, бо быў ён па-юнацку шчыры й чысты душой. Некалькі гадоў таму пачаў пісаць вершы. Па адукацыі выкладчык расейскай мовы й літаратуры, паэт Янка Карповіч пісаў вершы толькі па-беларуску. "Інакш не пішацца", — казаў ён. "Люблю сваю Бацькаўшчыну, свой куточак у роднай вёсцы. І калі прыязджаю ў вёску да сваёй матулі (дзякуй Богу, яна яшчэ жывая), то іду да свайго куточка, каб сказаць яму «добры дзень», каб успомніць... І ў думках бачу яго ранейшым, хоць на тым месцы ўжо даўно рукатворнае возера калгаса «Беларусь»", — расказваў паэт-юбіляр пра сябе ў ліпені 2001 году. Але найпепш пра яго расказваюць ягоныя вершы:

Бацькоўскі парог
Сьвеціць ласкавым знакам,
Далеч дзён і гадоў,
І бацькоўская хата,
Мілы клёкат буслоў.
Я не ведаю, дружа,
Што мне вырашыць лёс,
А пад раньне падушка
Ўся макрэе ад сьлёз.
Ты са мною, Радзіма,
Мой бацькоўскі парог,
Застанешся адзінай
Паміж многіх дарог.

*"Газэта Слонімская" , 2001 г., № 51*

У цяжкія для Беларусі часы аўтарытарнага рэжыму Іван Карповіч уключыўся ў грамадзкае жыцьцё Слонімшчыны. Быў актывістам Таварыства беларускай мовы, выступаў у прэсе з крытыкай чынавенства, у абарону роднага слова. Натхнёна ўспрыняў ён і ідэю стварэньня грамадзкага аб'яднаньня "Ветэраны Адраджэньня". Пэўна таму, што найлепей пачуваўся сярод сяброў па духу. "Як прыемна сярод сваіх. Тут я адпачываю душою", — ня раз казаў пад час сустрэч з аднадумцамі. Ён перажываў няўдачы кожнага з нас і радаваўся нашым посьпехам. Побач зь ім было лёгка й сьветла.

Іван Карповіч застаўся з намі назаўжды. Бо ветэраны Адраджэньня не зыходзяць у нябыт. Яны працягваюць жыць у нашых сэрцах.

*Сябры грамадзкага аб'яднаньня "Воля да разьвіцьця" й слонімскай суполкі "Ветэраны Адраджэньня"*

## Памёр Мікола Рулінскі

Сумная вестка прыйшла зь Вільні. Пасьля цяжкой хваробы памёр вядомы беларускі патрыёт Мікола Рулінскі (1923—2002).

М.Рулінскі ў міжваенным часе скончыў славутую Віленскую беларускую гімназію, пад час нямецкай акупацыі вучыўся ў настаўніцкай семінарыі ў Навагрудку. Разам зь іншымі маладымі настаўнікамі ў 1943 годзе ўступіў у беларускае войска, у эскадрон Б.Рагулі. Улетку 1944 году Рулінскі пакінуў Бацькаўшчыну, служыў у беларускай вайсковай фармацыі ў Нямеччыне, меў ранг лейтэнанта. Быў сябрам падпольнай Беларускай незалежніцкай партыі (ад 1944 году). Увосень 1944-га, разам з Піліпам Давідчыкам, ратаваў з Рыгі архіў і бібліятэку Кастуся Езавітава. Да 1949 году, да арышту дзяржбясьпекай, Мікола Рулінскі жыў у Польшчы. Пасьля зьняволеньня ў маскоўскіх і менскіх турмах быў асуджаны на 25 гадоў канцлягераў. Кару адбываў на Кузбасе, у Омску, дзе будаваў першы ў Сібіры нафтаперагонны завод (афіцыйна падавалася, што яго будуюць камсамольцы). Выйшаў на волю ў 1957 годзе, пасяліўся ў Вільні. Займаўся творчасьцю: пісаў вершы, маляваў краявіды. Браў удзел у сустрэчы «рагулеўцаў» у Вільні ў ліпені 1997 году.

Сьветлая памяць!

*С.Ё.*



*Аляксандар Чарніцкі*

## Бацька іўрыту — наш зямляк

*У часы маскоўска-камуністычнага прыгнёту, калі лютавалі галоўліты, глушакі й “мастацтвазнаўцы ў цывільным”, вальнадумцы зьбіралі цэлыя бібліятэчкі з публікацый савецкіх “выкрывальнікаў” сыянізму, беларускага й украінскага нацыяналізму. Сярод мякіны хлусьні палітпропу яны знаходзілі зярняткі праўды. І гэтыя зярняткі сьведчылі, што ня ўсё страчана паняволенымі народамі, што іх змаганьне за адраджэньне працягваецца. І як калісьці юнака зь беларускіх Лужкаў Лазара Пэрэльмана натхніў прыклад маленькага баўгарскага народу, які вызваліўся з-пад турэцкай няволі, так і не аднаго беларускага юнака натхняў прыклад габрайскага народу. Падаем тэкст дакладу Аляксандра Чарніцкага “Іўрыт і Бэн-Егуда” на фэстывалі габрайскай кніжкі ў Полацку 22 кастрычніка 2000 г.*

“Тов шэ хазарта абайта! Добра, што ты вярнуўся дадому!” Такі лозунг сустракае пасажыраў у аэрапорце імя Бэн-Гурыёна. “Тов шэ хазарта абайта!” — кажу я сёньня кожнаму, хто цікавіцца габрайскай культурай увогуле ды іўрытам у прыватнасьці. На шчасце, цяпер гэта можна рабіць, не хаваючыся. У СССР за вывучэньне іўрыту кідалі ў вязьніцы. Уявіце сабе: мова Ізраіля, незалежнай дзяржавы, адной з супольнікаў ААН, была забароненая!

Што такое іўрыт? Слова *іўры* на старажытнай сэміцкай гаворцы, якой карысталіся ў Бабілёне, значыла ‘зарэчны’. Множны лік — *іўрым*, гэта ‘зарэчныя’. Так называлі тых, хто разам з патрыярхам Абрагамам пайшоў за Эўфрат у пошуках новых пашаў для жывёлы. Назоў замацаваўся й за нашчадкамі Аўрамава роду: *іўрым* па-беларуску *яўрэі*, або *габраі*. Літаральна слова *іўрыт* значыць ‘мова зарэчных’.

У II стагодзьдзі да нашай эры іўрыт быў выціснуты з ужытку роднаснай арамейскай мовай і застаўся толькі моваю рэлігійных тэкстаў і малітваў. Зь цягам часу ў жыцьці ўзьнікалі паняцьці, для акрэсьленьня якіх у іўрыце не знаходзілася словаў. Адсутнасьць галосных літар спрычынялася да таго, што вымаўленьне шмат якіх словаў скажалася. Мова памірала.

Калі ў XIX стагодзьдзі ўзьнікла ідэя габрайскай дзяржавы, ніхто ня бачыў у іўрыце будучай дзяржаўнай мовы. Адсутнічалі словы для самых простых паняцьцяў: гальштук, генэрал, цягнік, ордэн... Рэлігійныя людзі лічылі блюзьнерствам карыстацца сьвятой мовай у побыце. Сьвецкія інтэлектуалы глядзелі на іўрыт як на мову артадаксальнага цемрашальства. Дый не было ў гісторыі выпадку, каб мёртвая мова зноў стала размоўнай.

Але знайшоўся чалавек, які зьдзейсьніў немагчымае. Звалі яго Лазар Пэрэльман, а нарадзіўся ён амаль паўтара стагодзьдзя таму — у 1859 годзе. Гэта адбылося ў мястэчку Лужкі Віленскай губерні. Цяпер гэта — вёска ў Шаркаўшчынскім раёне Віцебскай вобласьці. Бацька Лазара быў бедным хасідам. Ён памёр, калі сыну споўнілася пяць гадоў. У 1862 годзе маці завезла трынаццацігадовага хлопчыка вучыцца ў полацкі ешыбот — юдэйскую духоўную сэмінарыю.

Юнаку пашанцавала: рэктар ешыботу быў вальна-

думцам. Ён сам навучаў хлопчыка іўрыту й нават чытаў разам зь ім “Рабінзона Круза” ў перакладзе... на гэтую мову. Маці вельмі занепакоілася, даведаўшыся пра дзівацкую цікавасьць хлопчыка да іўрыту й сьвецкай літаратуры. Багаты дзядзька забраў пляменьніка зь ешыботу й прывёз да сябе ў Глыбокае, тыповае хасідзкае мястэчка. Але й там Лазар вывучаў іўрыт і чытаў “кепскія” кніжкі, за што атрымаў грэблівую мянушку “маскіл” (на самой справе маскіл — гэта ‘адукаваны чалавек’ )*. Уявіце, якую непрыязь да мястэчковага побыту мусіў адчуваць у сваім сэрцы Лазар Пэрэльман!

Ён атрымаў доступ у дом мясцовага дысыдэнта — шанаванага глыбоцкага хасіда Шмуэля Ёнаса. Гэты чалавек публікаваўся ў сьвецкай прэсе пад псэўданімамі, інакш у рэлігійным асяродзьдзі яго палічылі б здраднікам. Дочкі Ёнаса Дэбора й Хемда расьлі па-эўрапейску адукаванымі паненкамі. Старэйшая, Дэбора, стала навучаць Лазара расейскай мове. Атмасфера гэтага дому прымусіла Пэрэльмана задумацца аб працягу адукацыі, і дзядзька накіраваў юнака ў Дзьвінск (цяпер Даўгаўпілс) у рэальнае вучылішча. Там Лазара сустрэла “здань камунізму”, што блукала па калідорах і аўдыторыях. Хлопца апанавалі сацыялістычныя ідэі, і ён ужо падумваў далучыцца да народнікаў. Камунізм — рэч інтэрнацыянальная. “Я аддаліўся ад габрайскага народу, і ён уявіўся мне маленькім і нікчэмным, — успамінаў пазьней Бэн-Егуда.— Я жадаў працаваць для вялікага расейскага народу”.

Але вось у 1877 годзе пачалася расейска-турэцкая вайна. Захоплены гераічным змаганьнем баўгараў, Лазар Пэрэльман падумаў, што й яго маленькі народ мог бы адваяваць у туркаў Палестыну. «У той час раптам нібы расчыніліся нябёсы, і нутраны голас прамовіў: “Адраджэньне Ізраіля на зямлі продкаў!”» — пісаў пазьней Бэн-Егуда. Сьледам прыйшло й другое прасьвятленьне: мова — вось той цэмэнт, які зробіць з народу нацыю!

Мова ідыш на гэтую ролю ніяк не прыдавалася. Яна ўзьнікла ў выгнаньні на грунце нямецкіх і славянскіх дыялектаў. Гэта мова, на якой вякамі размаўлялі ахвяры ўціску, нагавораў і крывавых пагромаў. Мова будучай габрайскай краіны не павінна мець такой генэтычнай памяці. Нашчадкі старажытных герояў, якія вырвуць Палестыну з рук туркаў, павінны размаўляць на старажытнагабрайскай мове — што можа быць лагічнейшае?!

Пасьля вучылішча Пэрэльман паехаў у Парыж вучыцца на лекара. Ён справядліва меркаваў, што гэтая прафэсія — адна з самых дэфіцытных у Палестыне. А неўзабаве ў парыжскім часопісе “Га-шахар“ (“Сэнс”) зьявіўся артыкул, аўтар якога ўпершыню зьвязаў адраджэньне габрайскай дзяржаўнасьці з адраджэньнем іўрыту: “У нас ёсьць мова, на якой і сёньня мы можам пісаць і выявіць абсалютна ўсё, а калі ёсьць жаданьне — і загаварыць”. Гэты абуральны з гледзішча многіх габраяў артыкул быў падпісаны так: *Эліэзэр Бэн-Егуда*. За гэтым імем  і хаваўся наш Лазар. *Бэн-Егуда* на іўрыце азначае ‘Сын Юдэі’.

Ніхто не здагадваўся, што парушальнік спакою ўжо складае слоўнік ужывальных іўрыцкіх словаў — словаў, неабходных у звыклай размове. Частку іх ён знаходзіў у сьвятых кнігах юдаізму. Іншыя выдумляў сам, кіруючыся правіламі іўрыцкага словаўтварэньня.

Зьнясіленьне працай і нястача зрабілі сваю справу — неўзабаве Элізэр захварэў на сухоты. Папраўляць здароўе ён паехаў у сьпякотны Алжыр — заморскую калёнію Францыі. Там Бэн-Егуда канчаткова сфармуляваў мэту свайго жыцьця. Ён паедзе ў Палестыну ня лекарам, а Настаўнікам — Настаўнікам зь вялікай літары. Ён будзе навучаць свой народ забытай мове!

Пастаўце сябе на месца гэтага хлопца з Лужкаў. Вы зьбіраецеся паехаць у чужую краіну й прымусіць яе жыхароў загаварыць на новай мове. Як можна іх прымусіць? Арміі ў вас няма. Мафіі няма. Грошай няма. Няма нават ураду, да якога можна зьвярнуцца, бо не будзе ж Абдул-Гамід, турэцкі султан-цемрашал, насаджаць у Палестыне іўрыт. Няма й не было ў сьвеце краіны, жыхары якой згадзіліся б проста так вывучаць нейкую там мову, няхай яна хоць тройчы сьвятая мова — “ляшон га-кодэш”!

У жыцьцёвым сцэнары Бэн-Егуды не ставала толькі выканаўцы жаночай ролі. Эліэзэр прапанаваў руку й сэрца Дэборы Ёнас, сяброўцы юнацтва. Дэбора пагадзілася нават, што размоўнай мовай у іх сям’і стане іўрыт.

В 1881 годзе маладая сям’я пераехала ў Ерусалім. Там Эліэзэр загаворваў на іўрыце з кожным сустрэчным. Там ён выдумляў сотні неабходных словаў. Пазьней гэтым заняліся й ягоныя шматлікія пасьлядоўнікі, у тым ліку і буйныя палітыкі. У 1882 годзе ў Эліэзэра і Дэборы нарадзіўся сын Ітамар. Усё перадвызначана. Зь дзіцем можна гаварыць толькі на іўрыце. Гэта будзе першы за 2000 гадоў чалавек, для якога іўрыт — родная мова!

У 1884 годзе ў палестынскіх школах адчыніліся першыя іўрыцкія класы. І адным з першых настаўнікаў быў Бэн-Егуда.

Але вось сын Бэн-Егуды падрос і пачаў выходзіць гуляць на вуліцу. Навокал бегалі хлапчукі й гергеталі нешта незразумелае. А з гледзішча суседскіх хлапчукоў усё было якраз наадварот. Яны зьярталіся да Ітамара на ідышы або па-арабску, а той у адказ лапатаў на мове, зь якой габрайскія дзеці разумелі толькі паасобныя словы.

Бацька завёў сыну сабаку. Ідуць людзі ў сынагогу,

* У XIX стагодзьдзі ў габрайстве быў грамадзкі рух асьветніцтва, які называўся “маскілім”. — *Заўв.рэд.*

бачаць хлопчыка, які гаворыць з сабакам, і раптам чуюць, што нягоднік зьвяртаецца да сабакі на сьвятой мове! На мове прарокаў — з псінай шалудзівай! Суседзі люта ўзьненавідзелі сям'ю Бэн-Егуды. Плакаў Ітамар, галасіла Дэбора. Угару пайшлі лісты: маўляў, нягоднік Бэн-Егуда задумаў аддзяленьне Палестыны ад імпэрыі і ўжо распрацоўвае мову паўстанцаў. Туркі арыштавалі яго. Але, пратэстуючы супроць несправядлівасьці, на вуліцы выйшлі ягоныя прыхільнікі. А іх было нямала! З усяго сьвету ехалі ў Сьвятую зямлю ідэалісты. За нязломнага лінгвіста заступіўся сам барон Эдмон дэ Ротшыльд, адзін з асноўных фундатараў габрайскай калянізацыі Палестыны. Вэрсія пра падбухторваньне да закалоту рассыпалася, і Бэн-Егуду вызвалілі.

У 1888 годзе памерла Дэбора. У Ерусалім прыехала родная сястра нябожчыцы Хемда. Яна вырашыла сваёй прысутнасьцю дапамагчы пляменьніку Ітамару перажыць сьмерць маці. Як і Дэбора, Хемда была сучаснай эўрапейкай. Але неўзабаве й яна выйшла замуж за Бэн-Егуду!

Гэты факт цудоўна ілюструе асобу Бэн-Егуды. Папершае, такія людзі зачароўваюць іншых. У Бэн-Егуды быў той магічны магнэтызм, які мы называем сёньня харызмай. Па-другое, такія людзі падпарадкоўваюць пастаўленай мэце саміх сябе, сваіх родных і блізкіх. Чужыя інтарэсы ў разьлік не бяруцца. Сьмерць паплечнікаў і блізкіх нічога не мяняе.

Хемда прыехала ў добры час. Суседзі ўжо не пісалі ананімак турэцкім уладам. У Ітамара зьявіліся іўрытамоўныя сябры. На поўначы краіны, у Галілеі, у 1890 годзе выкладаньне на іўрыце вялося ва ўсіх школах. Яшчэ праз шэсьць гадоў у калёніі Рэхавот адчыніўся першы дзіцячы садок, дзе выхаваньне было на гэтай мове.

Тым часам расейскае самаўладзьдзе міжволі працягвала падштурхоўваць габраяў да стварэньня Ізраіля й адраджэньня іўрыту. Пасьля хвалі пагромаў 1904—1905 гадоў па ўсёй Расеі гучала сыянісцкая песьня: "У нас ёсьць краіна Палестына, у якой мы будзем есьці хлеб і сыр..." Народу ў Палестыне прыкметна дадалося. Ужо ў 1906 годзе ў Яфе была адчыненая першая іўрытамоўная гімназія. Назвалі яе "Гэрцлія", ушанаваўшы памяць заснавальніка сыянісцкага руху Тэадора Гэрцля.

Між іншага, лідэр сыянізму Тэадор Гэрцль адраджаць іўрыт зусім не зьбіраўся. "Ці ведае хто з нас іўрыт нагэтулькі, каб набыць чыгуначны квіток?" — пытаўся ён у 1894 годзе. Тады пад кіраўніцтвам Бэн-Егуды ўжо працавала цэлая "фабрыка" іўрыту, але Гэрцлю зручней было карыстацца роднай нямецкай. Дый афіцыйнай мовай сыянісцкіх кангрэсаў была нямецкая. Нават "Тэхніён", першую ў Палестыне вышэйшую тэхнічную школу, плянавалася адчыніць у 1913 годзе на нямецкай мове. Зь Нямеччыны зьбіраліся запрасіць і прафэсараў...

Можна ўявіць радасьць і ўзрушэньне Бэн-Егуды, калі ён пачуў пра хваляваньні ў Хайфе: моладзь патрабавала, каб выкладаньне ў "Тэхніёне" вялося на ягоным родным іўрыце. Пры жыцьці аднаго пакаленьня стала жывою мова, якой раней палестынскія сэфарды (габраі з Усходу) і ашкеназі (эўрапейскія габраі) карысталіся ў лепшым разе для гутаркі на кірмашы. У 1914 годзе ў "Тэхніёне" пачалі выкладаць на іўрыце хімію, фізыку, супор матэрыялаў, вышэйшую матэматыку ды іншыя навукі. А ў 1920 годзе брытанская адміністрацыя Палестыны прызнала іўрыт трэцяй афіцыйнай мовай побач з арабскай і ангельскай.

Сёньня на іўрыце гавораць больш за 6 мільёнаў жыхароў Ізраіля, у тым ліку мільён ізраільскіх арабаў і сотні тысяч украінцаў, расейцаў, беларусаў і казахаў. Бэн-Егуду лічаць сваім і ў Лужках, і ў Глыбокім, і ў Полацку, і ў Даўгаўпілсе, і ў Парыжы. Ну, а ўжо ў Ізраілі ў кожным вялікім горадзе ёсьць вуліца яго імя.

*Уладзімір Конан*

## Пра Лявон-рыцара ды Лаўрэнція-аглабельніка

Памятаю адзін эпізод з жыцьця Лявона Баразны, калі выявілася яго рыцарская натура.

А сталася вось што. Пад канец 1964 году скончылася “хрушчоўская адліга”. Першага савецкага перабудоўніка адправілі на пэнсію “па стане здароўя” (дыягназ паставіў Пленум ЦК КПСС). Той засеў на дачы, каб працягваць свае сельскагаспадарчыя экспэрымэнты на абмежаванай прасторы Падмаскоўя. У 1965 годзе пачаўся “залаты век” савецкай бюракратыі, вядомы сёньня як эпоха застою. Партакраты ды іншыя бюракраты трыюмфавалі, насілі на руках свайго куміра Брэжнева, крычалі “ура!” й патрабавалі адпаведных паводзінаў ад сваіх падначаленых, гэта значыць ад усёй савецкай краіны.

І вось у такія шчасныя дні афіцыйных банкетаў і апладысмэнтаў у Акадэміі навук БССР усчалася агульнарэспубліканская дыскусія на крыху дзіўную для таго часу тэму: “Хто такі Афанасій Філіповіч?” Уся соль была якраз у падтэксьце, дзе пытаньне гучала інакш: “За якую ідэю змагаўся ды цярпеў пакуты Філіповіч? За праваслаўную? За беларускую? А можа, за расейскую?”

Ідэю дыскусіі падказалі, здаецца, гісторыкі. Але пачалася яна ў асяроддзі акадэмічнага Інстытуту літаратуры — тагачаснага парушальніка афіцыйнага спакою. Зразумела, рэч была ня ў тым, хто такі Афанасій, або, па-нашаму, Апанас, а ў альтэрнатыве беларускага выбару паміж праслаўленым бальшавікамі Усходам і праклятым імі ж Захадам.

Шум і гоман пачаўся з кніжкі А.Коршунава “Афанасий Филиппович: Жизнь и творчество” (Мн., 1965). Яна была напісаная ў звыклым для таго часу афіцыйна-атэістычным ключы, з рэвэрансамі ў бок патрыятычнага праваслаўя, з праклёнамі на адрас езуітаў, вуніятаў ды іншых “захопнікаў”. Але кніга цікавая ўжо тым, што была амаль першым афіцыйным дасьледваньнем пра жыцьцё царкоўнага асьветніка й кананізаванага вялікапакутніка. Да таго ж у дадатку да кнігі надрукаваны “Дыярыюш” А.Філіповіча.

Ды ўсё ж прычына ня ў гэтай кніжцы, а ў рэцэнзіі на яе, якую апублікаваў у “Полымі” (1965, № 12, с. 174—177) малады кандыдат навук Мікола Прашковіч, вучань вядомага расейскага гісторыка літаратуры І.Ярэміна, аўтар дысэртацыі “Паэзія Сімеона Полацкага” (1964) і артыкулаў пра беларускага першадрукара Францішка Скарыну. Рэцэнзэнт пахваліў і вялікапакутніка Афанасія ігумена брэсцкага, і дасьледніка ягонай спадчыны А.Коршунава. Мала хто зьвярнуў бы ўвагу на гэтую рэцэнзію, каб ня рэдкі для тагачаснага “савецкага грамадзтва” дар Міколы Прашковіча: гаварыць праўду, глядзець на сьвет афіцыйнай маны й прагматычнага ашуканства шчырымі, донкіхотаўскімі вачыма. Вось ён і напісаў, што пад час свайго падарожжа па Беларусі А.Філіповіч “пазнаёміўся з ігуменам Куцейнаўскага манастыра Труцэвічам, які знаходзіўся на шпіёнскай службе ў рускага цара”. Што пад уплывам Труцэвіча ў Афанасія зьявілася думка паехаць у Маскву й за важныя зьвесткі атрымаць ад маскоўскага цара матэрыяльную дапамогу для свайго Купяціцкага манастыра.

Сакрэт, што, відаць, перадаў Філіповіч тагачаснай маскоўскай контрвыведцы, датычыў нейкага Яна Лубы, якога выхоўвалі пры двары Лева Сапегі (а выхавальнікам быў А.Філіповіч) і выдавалі за сына забітага ў Маскве Дзімітра Самазванца (ці Зьмітра Іванавіча, сына Івана IV, як сьцьвярджалі ў Вялікім Княстве Літоўскім) і Марыі Мнішак.

Больш за тое, М.Прашковіч пісаў нешта зусім жахлівае для бальшавіцкіх бюракратаў і “вучоных”: быццам у Масковіі XVII стагодзьдзя прыгон быў у некалькі разоў цяжэйшы, чым у Вялікім Княстве Літоўскім, а вуніяты не былі такімі ўжо “заўзятымі разбойнікамі, ворагамі народу”, як гэта здалося А.Коршунаву. Берасьцейскую вунію, казаў Прашковіч, трэба разглядаць у дыялектычным разьвіцьці, бачыць станоўчыя й адмоўныя бакі. Праведзеная “пад націскам езуітаў і польскіх магнатаў”, вунія ў XVII—XVIII стагодзьдзях разьвівалася як нацыянальная рэлігія беларусаў і ўкраінцаў. Каб яе не забараніў царызм, магла б стаць “зьявай, вакол якой кансалідаваліся б сілы народу, магла б садзейнічаць выпрацоўцы нацыянальнай сьвядомасьці, патрыятызму, барацьбе за народную мову”. Урэшце, на думку Прашковіча, вунія “вызваліла б беларусаў і ўкраінцаў ад візантыйскага дэспатызму”, спрыяла б прымірэньню праваслаўнага ды каталіцкага сьветаў.

Гэта быў яўны наступ на афіцыйную дагматыку. Вось тут ужо не сьцярпеў уплывовы пры ўсіх бальшавіцкіх “западнорусских” дварах Лаўрэнцій Сямёнавіч Абэцэдарскі. Зь ягонай падачы асьпіранты БДУ імя Леніна В.Люкевіч і Я.Трашчонак апублікавалі ў “Советской Белоруссии” ліст пад тыпова “абэцэдарскім” загалоўкам “Истине вопреки”. Гісторыкі-пачаткоўцы паводзілі сябе як “члены” бюро райкаму: прабралі ня толькі Прашковіча, погляды якога, на іхную думку, “давно разоблачены советскими историками, как научно несостоятельные и политически сомнительные”, але й часопіс “Полымя”, які надрукаваў “эти ложные утверждения”. Урэшце нагадалі рэдакцыі, “что ей нужно внимательно читать все материалы, которые печатаются в журнале” (“Советская Белоруссия”, 1966, 22 лют.).

І вось тады бальшавіцкі ідэолаг *Советской Белоруссии* Абэцэдарскі трапіў у пастку: згадзіўся ўдзельнічаць у акадэмічнай дыскусіі па гэтай спрэчцы. Хоць нават і мне, тады малавопытнаму малодшаму супрацоўніку, было зразумела, што Абэцэдарскі з сваімі акадэмічнымі пасьлядоўнікамі апынецца ў ізаляцыі. Так яно й атрымалася. Адзін за адным выступалі літаратуразнаўцы, гісторыкі, нават філёзаф (здаецца, Мікола Алексютовіч)

і, аддаўшы службовую даніну афіцыйнаму атэізму ды марксісцка-ленінскай дыялектыцы, мякка пакрытыкаваўшы М.Прашковіча за “вуніяфільства” ды палемічныя перабольшаньні, даволі грунтоўна, хоць і ветліва, раскрытыкавалі абэцэдаршчыну. Лаўрэнцій Сямёнавіч знутры ўвесь кіпеў, але спачатку трымаўся цьвёрда, як той Куляшовы “юнак на дапросе”, паўтараючы свае вядомыя аргумэнты і тэзісы.

Недзе ў сярэдзіне дыскусіі выйшаў на трыбуну малады мажны мужчына з адкрытым і спакойным тварам, зусім не падобны на шараговага, вечна прыгорбленага навукоўца зь ягонай 83-рублёвай “палучкай”. “Я мастак Лявон Баразна, — адрэкамэндаваўся не знаёмы публіцы аратар. — Я не акадэмічны вучоны, але трохі разьбіраюся ў праблеме, аб якой ідзе спрэчка.”І ў межах афіцыйнай карэктнасьці, але бяз гэтых згодніцкіх “аднак”, “тым ня менш”, “з аднаго боку і з другога боку” паказаў усю антынавуковасьць абэцэдаршчыны, пераканаўча давёў слушнасьць Прашковічавых сьцьверджаньняў.

На жаль, не знайшоў я стэнаграмы таго дыспуту ці хоць бы пратакольнай справаздачы ў друку, каб больш падрабязна пераказаць выступ Л.Баразны. Тады друк абыходзіў такія скандалы, асабліва калі на іх бітымі аказваліся афіцыйныя ідэалягічныя прыказчыкі. Лаўрэнцій Сямёнавіч узарваўся, здаецца нешта крычаў, урэшце пагрозліва паківаў на ўсіх пальцам (у перакладзе на афіцыйны “большевистско-энкавэдистский язык” гэты жэст, відаць, азначаў: “Подождите, едрёна вошь, я вам еще покажу, кто вы такие!”) і пакінуў акадэмічны амфітэатар.

З тае пары Лявон Баразна й Мікола Прашковіч сталі аб’ектамі пільнага нагляду адпаведных ворганаў.

Пазнаёміліся Лявон і Мікола, здаецца, на ніве скарыназнаўства: М.Прашковіч быў аўтарам цікавых нарысаў пра нашага першадрукара, а Л.Баразна зьбіраў матэрыялы для свайго альбому “Гравюры Францыска Скарыны” (1972).

Пазьней некалькі разоў сустракаў я Лявона ў таварыстве фальклярыстаў: тады ён грунтоўна вывучаў беларускія народныя строі, іншыя віды традыцыйнага народнага мастацтва. Аднаго разу ён зусім нечакана прапанаваў накідаць алоўкам эскіз майго партрэту. На жаль, спачатку нешта не атрымалася, справу адклалі й яна забылася ў тлуме дзён.

З герояў і антыгерояў маёй нататкі сярод жывых не засталося нікога. Першым загінуў Лявон: яго забілі на вуліцы ў гістарычным цэнтры Менску, зарэзалі кухонным нажом два браты — тыповыя мутанты й дэгенэраты.

Інакш расправіліся зь Міколам Прашковічам свае “тоже-белорусские” рэнэгаты. Недзе на пачатку 70-х гадоў ён пачаў сваю ўласную галоснасьць і перабудову: у яго зьбіралася невялікая групоўка беларускіх адраджэнцаў і на сваіх “тайных вячэрах” гаварылі пра БНР, беларускую Вільню і Смаленшчыну. Мікола нават зьбіраў сродкі ў фонд салідарнасьці з украінскімі дысыдэнтамі.

А дзе “тайная вячэра”, там, як вядома, паводле кампазыцыі, ёсьць месца для Юды. Хлопцаў пачалі цягаць у КГБ, дапытваць — той-сёй выкручваўся, як мог, а Мікола казаў праўду. Праз кагэбісцкае сіта прапусьцілі добрую сотню навуковых супрацоўнікаў, пісьменьнікаў. А наконт Міколы загадалі: звольніць з працы “за действия, не совместимые со статусом научного сотрудника”. Так, здаецца, і прайшла гэтая фармулёўка на таемным галасаваньні вучонага савету. Хто галасаваў за гэта супраць свайго ўласнага сумленьня, відаць, ведаў (а можа, і перабольшваў) — для таемнай ідэалягічнай паліцыі ніякіх таямніцаў не бывае.

З М.Прашковічам паступілі “гуманна”: не пасадзілі ў вастрог, дазволілі вядомаму ў славянскім сьвеце вучонаму працаваць малодшым карэктарам “Вечернего Минска”. Мікола цяжка перажываў здраду і татальнае адчужэньне. А жыць сам-насам з Богам ня ўмеў: той рэжым, які прыгнятаў нашыя асобы, яшчэ раней абязбожыў нашыя душы. Прапакутаваўшы гадоў сем у Менску, Мікола вярнууўся ў родную вёску хворым і пры загадкавых абставінах памёр.

Мабыць, душа Лявона Баразны цяжка перажывае, што ягонага сябра цяперашняя Рэспубліка Беларусь і Акадэмія “забыліся” рэабілітаваць...

Лаўрэнцій Абэцэдарскі памёр героем і вялікім вучоным: так, здаецца, значылася ў некралогу, падпісаным савецка-партыйнай і савецка-вучонай элітай на чале з П.М.Машэравым.

*13.03.1993 г.*

*Міхась Ткачоў*

## З адказаў на пытаньні дэлегатаў Устаноўчага зьезду БСДГ
(3 сакавіка 1991 г.)

Як і кожны чалавек, пры нараджэньні я быў ахрышчаны. Пахрысьцілі мяне ў праваслаўнай Аляксандра-Неўскай царкве ў Амсьціславе. Прычым двойчы. У вайну часам два разы хрысьцілі. Для страхоўкі. Кірунак маёй душы вельмі просты — жыць па тых запаведзях, якія пакінулі нам нашы дзяды, нашы бацькі. Таму што большасьць маіх аднагодкаў вырасла без бацькоў, бо іх хрысьціла вайна й не адпусьціла з вайны. А мы вырасьлі на іхным прыкладзе. Так што за маю душу можаце быць спакойныя — на ёй ніякіх плямаў няма...

Жыцьцёвы шлях мой пачаўся ў 1941 годзе, 10 сакавіка, у горадзе Амсьціславе Магілёўскай вобласьці ў сям’і настаўнікаў. Вясковых, дарэчы, настаўнікаў. Бацьку

майго забралі на фронт яшчэ ў Фінскую, як тады казалі, кампанію. Прабыў усю кампанію, а загінуў ужо на пачатку Айчыннай вайны недзе пад Пецяргофам, палёг у ленінградскіх балотах.

Пасьля вайны маё жыцьцё было, як і большасьці маіх сяброў, і цяжкім, і галаднаватым. Маці, праўда, выйшла замуж другі раз і нарадзіла яшчэ двое дзяцей.

Пасьля 5-га класа я ўжо хадзіў працаваць на цагельню. А да гэтага былі шчасьлівыя гады, калі я пасьвіў кароў, як і ўсе дзеці майго кола.

Я скончыў школу ў 1959 годзе, а потым у 1964-м — гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Затым чатыры з паловай гады працаваў у Смалявіцкім раёне ў сярэдняй школе. Паступіў у асьпірантуру пры Інстытуце гісторыі Акадэміі навук, скончыў яе па сьпецыяльнасьці археалёгія. Дзесяць гадоў адпрацаваў у гэтым жа інстытуце. Пры адкрыцьці Гарадзенскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту быў запрошаны туды выкладчыкам археалёгіі й гісторыі, дзе працаваў адзінаццаць гадоў.

Дзе ні быў, стараўся працаваць сумленна. Гэта галоўная ўстаноўка майго жыцьця. Як дасьледнік, нешта маю — шэсьць манаграфій, больш за сотню артыкулаў, у тым ліку й навуковых.

У нацыянальны дэмакратычны рух прыйшоў у 1960 годзе пасьля знаёмства з адным цікавым чалавекам. Ён сядзіць у гэтай зале — Міхась Чарняўскі. Праз яго я і ў археалёгію прыйшоў. Але найбольш, мусіць, на мяне паўплывала тая адліга хрушчоўскае пары, тыя людзі, што павыходзілі з канцлягераў. Гэта нашыя пісьменьнікі й сярод іх ужо нябожчык Станіслаў Шушкевіч, гісторык Мікалай Улашчык, Язэп Сушынскі, які разам зь Янкам Купалам пачынаў у Піцеры выдавецкую суполку “Загляне сонца і ў наша ваконца”. На спатканьнях і сустрэчах з гэтымі людзьмі ўпершыню адчуў, што я сапраўды беларус, што за маімі плячыма — гісторыя, а я гэтую гісторыю дрэнна ведаю. Вось з тае пары й стараюся спазнаць яе як мага лепей.

Сёньня я ўзначальваю рэдакцыю гісторыі ў выдавецтве “Беларуская Савецкая Энцыкляпэдыя”, якая працуе над двума вельмі цікавымі выданьнямі — гэта “Энцыкляпэдыя археалёгіі й нумізматыкі Беларусі” і шматтомная “Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі”. Думаю, што, калі на небе ўсё будзе спакойна й плянэты будуць стаяць так, як трэба, мы выдадзім гісторыю Беларусі, у энцыкляпэдычным, праўда, выглядзе, без усякіх белых плямаў.

Мы пакажам і назавем імёны тых, хто не шкадаваў свайго здароўя й жыцьця, ішоў гэтым цяжкім торам у імя будучыні нашай. Мы вернем нашаму народу тыя імёны, якія доўга ганьбілі, плямілі, трымалі ў сьпецсховах. І сёньня, калі сонца праўды прабілася да іх, мы бачым, якія гэта былі сумленныя, крыштальна чыстыя людзі...

## АРХІЎ

*Сяргей Ёрш*

### “Лепш я загіну адзін, але іншых ня выдам...”

*19 ліпеня 1943 году начальнік Цэнтральнага штабу савецкага партызанскага руху й кіраўнік кампартыі Беларусі генэрал-лейтэнант Панцеляймон Панамарэнка атрымаў сьпецпаведамленьне “пра дзейнасьць удзельнікаў контррэвалюцыйнай нацдэмаўскай арганізацыі лістападаўцаў на акупаванай тэрыторыі Менскай вобласьці”. У ім паведамлялася пра арышт на пачатку красавіка 1943 году асобым аддзелам 2-й Менскай брыгады савецкіх партызанаў (камандзір — С.М. Іваноў) Нічыпара Мяцельскага — “нацдэма”, “контррэвалюцыянера”, “лістападаўца”...*

Гісторыя Нічыпара Мяцельскага пачынаецца яшчэ ў 1924 годзе, калі ён разам зь сябрамі удзельнічаў у стварэньні на Случчыне падпольнай антыбальшавіцкай арганізацыі пад кіраўніцтвам Юркі Лістапада. Падпольшчыкі распаўсюджвалі антысавецкія ўлёткі й адозвы, выдавалі рукапісны часопіс “Наша слова”. Але неўзабаве былі выкрытыя й арыштаваныя ГПУ. Судовы працэс праходзіў у Менску. “Лістападаўцаў” — Нічыпара Мяцельскага, Міхася Макарэню, Міколу і Рыгора Казакоў, Міхася Дзямідовіча і самога Юрку Лістапада — засудзілі на розныя тэрміны зьняволеньня. Пасьля вяртаньня на Бацькаўшчыну Мяцельскі настаўнічаў у школе вёскі Цітва Рудзенскага раёну. Працаваў там і пад нямецкай акупацыяй.

Вясной 1943 году ў менскай “Беларускай газэце” зьявіўся артыкул Р.Крушыны (Міколы Казака) “З мінулых дзён. Судовы працэс над Лістападам (5—18 сакавіка 1926 г.)”, у якім падрабязна апісваліся тыя падзеі. Газэты, што выходзілі з дазволу нямецкіх акупантаў, уважліва чытаў “асобы аддзел” савецкіх партызанаў, які й зацікавіўся “лістападаўцамі”. Нягледзячы на барацьбу зь нямецкімі акупантамі, “асобыя аддзелы” савецкіх

партызанаў знаходзілі час і сілы для "зачысткі" тэрыторыі Беларусі ад «ненадзейнага элемэнту».

"На аснове матэрыялаў, што паступілі ад Н.Лобач і М.Рысевіч, быў арыштаваны Мяцельскі Нікіфар Лукіч, 1905 году нараджэньня, ураджэнец в.Ануфравічы, Грэскага раёну, беларус, беспартыйны, жанаты, які ў 1926 годзе прыцягваўся да суда ў справе контррэвалюцыйнай нацдэмаўскай арганізацыі пад кіраўніцтвам Лістапада…", — пісаў начальнік "Беларускага штабу партызанскага руху" П. Калінін Панамарэнку (НАРБ, ф.3500, в.2, спр.46, арк.96).

У вачах супрацоўнікаў "асобага аддзела" Мяцельскі выглядаў як "небяспечны элемент". Вось і "Беларуская газэта" пісала пра яго: "Найбольш блізкі сябра Лістапада — Мяцельскі… Патрыёт свае радзімы, гадунец вёскі, ён разважаў, што ўлада павінна быць вылучна сялянская…"

— У выпадку вайны, — пісаў Мяцельскі, — трэба арганізаваць беларускія аддзелы, якія дапамагалі б культурным народам Эўропы зьнішчыць дзікі бальшавізм. Гэтыя аддзелы павінны перайсьці ў наступ супраць савецкай улады і стварыць нацыянальны беларускі ўрад (НАРБ, ф.3500, в.2, спр.51, арк.31).

Нічыпара Мяцельскага арыштавалі, дапыталі й расстралялі ў адзін дзень — 6 красавіка 1943 году. Яго абвінавачвалі ў тым, што ён, "пасьля адбыцьця пакараньня аднавіў сваю контррэвалюцыйную дзейнасьць". У прыватнасьці, Мяцельскі аднавіў сувязі з былымі "лістападаўцамі" Міколам Казаком і Міхасём Макарэнем, "з мэтай актывізацыі нацдэмаўскай контррэвалюцыйнай дзейнасьці, накіраванай супраць савецкай улады й бальшавізму".

У сакавіку 1943-га адбылася нарада ў Слуцку, на якой яны аналізавалі палітычную й ваенную сітуацыю. Дзейнічалі нібыта пад кіраўніцтвам рэдактара менскай газэты "Голас вёскі" Аляксея Сянькевіча. А Сянькевіч уваходзіў у кіраўніцтва падпольнай антыфашысцкай і антыбальшавіцкай Беларускай незалежніцкай партыі (БНП). Таму зусім магчыма, што "лістападаўцы" маглі быць мясцовай суполкай БНП.

Аднак чэкістам Мяцельскі амаль нічога не расказаў. Ён адмовіўся назваць сяброў арганізацыі ў Рудзенскім, Пухавіцкім ды іншых раёнах, заявіўшы: "Лепш я загіну адзін, але іншых не выдам" (НАРБ, фонд 3500, вопіс 2, справа 46, аркуш 96 адгорт).

Пастановай начальніка "асобага аддзела" брыгады Нікчыпар Мяцельскі быў засуджаны на расстрэл. Агенты "асобага аддзелу" атрымалі заданьне "разрабатывать" Казака й Макарэню, якія жылі ў Слуцку. Казака "разработать" не ўдалося — у 1944 годзе ён выехаў на эміграцыю, дзе набыў вядомасьць як паэт Рыгор Крушына. Напэўна, ня раз шкадаваў ён пра той неасьцярожны артыкул у газэце, які стаў сьмяротным прысудам ягонаму сябру…

Мікола Ракевіч

## Патрыёт Беларусі

*У лістападзе мінулага году споўнілася 75 гадоў зь дня нараджэньня Міхася Ракевіча — аднаго зь ініцыятараў і кіраўнікоў беларускай патрыятычнай падпольнай арганізацыі "Чайка".*

Міхась Ракевіч нарадзіўся 19 лістапада 1927 году ў вёсцы Ваўчкі Азярніцкага сельсавета (цяпер Слонімскі раён) у сялянскай сям'і. Ягоны бацька, Міхал, на пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя пэўны час працаваў рабочым на шахтах Амэрыкі, але неўзабаве вярнуўся ў родную вёску, ажаніўся тут. Першынец Міхась быў пестуном усёй сям'і. Бацькавыя расказы пра Амэрыку, яе людзей і лад у гэтай краіне, захаплялі й заварожвалі Міхаську. Вялікі ўплыў на хлапчука ў дзяцінстве й юнацтве мелі дзядзька Мікалай (на той час студэнт Варшаўскага ўнівэрсытэту) і яго жонка Феафанія. Абое былі шчырымі патрыётамі Беларусі. Яны ж былі й настаўнікамі Міхася ў школах Азярніцы й Слоніма.

Пасьля выгнаньня немцаў зь Беларусі ў 1944 годзе народ з палёгкай уздыхнуў, спадзеючыся, што ягоныя пакуты скончыліся. Але прышлы пад выглядам вызваленцаў люд пачаў таптаць сваім чужацкім ботам нашыя сьвятыні: мову, культуру, нацыянальныя каштоўнасьці. Выхаваны ў атмасферы шчырасьці й павагі да людзей, юны Міхась Ракевіч балюча перажываў усё гэта. Таму зусім заканамерна ён знайшоў сваё месца ў патрыятычнай падпольнай арганізацыі "Чайка", якая ўзьнікла на Слонімшчыне вясною 1946 году. У Берасьцейскім чыгуначным тэхнікуме, дзе Міхась вучыўся, ён стварыў падпольную групу, а ў арганізацыі "Чайка" быў адказны за ваенныя пытаньні. Па-сутнасьці, Міхась Ракевіч быў правай рукой кіраўніка падпольнай арганізацыі Васіля Супруна. Арганізацыя "Чайка" за год існаваньня стварыла падпольныя групы, апрача Слоніма, у Баранавічах, Берасьці, Ганцавічах, Пінскай і Маладзечанскай абласьцях.

Барацьба была няроўнай, але нішто не магло пагасіць імкненьня да свабоды й незалежнасьці нашых патрыётаў — Васіля Супруна, Міхася Ракевіча, Аляксандра Гардзейкі, Міхася Чыгрына, Уладзіміра Салаўя ды іншых.

У чэрвені 1947 году пачаліся арышты. Міхась Ракевіч у той дзень дапамагаў маці ўпраўляцца па гаспадарцы. Чэкісты не далі яму нават да канца прайсьці пракос на лузе каля бацькоўскай сядзібы. У хаце зрабіліператрус, забралі фотакарткі й розныя паперы.

Пацяклі бясконцыя ночы ў баранавіцкай сьледчай турме "Крывое кола" й менскай "амэрыканцы". Прысуд быў суровым: 25 гадоў пазбаўленьня волі й 5 гадоў высылкі. Далей — паўночная Інта, Варкута. У сырых загазаваных шахтах М.Ракевіч здабываў вугаль да 1956 году.

Але й пасьля вызваленьня з турмы ён вымушаны быў застацца працаваць у шахтах Інты рабочым, а потым горным інжынерам па тэхніцы бясьпекі. Рабочыя ставіліся да яго з павагай за чуласьць і справядлівасьць, а начальства — з насьцярожанасьцю, як да былога зьняволенага. Некалькі разоў Міхась Ракевіч спрабаваў уладкавацца ў шахцёрскім Салігорску, але заўсёды атрымліваў адмоўны адказ. Патрыёту Беларусі дазвалялася працаваць толькі ў паўночных раёнах Расеі. Так і дажыў Міхась Ракевіч да пэнсіі ў Інце. А тут яшчэ захварэла жонка. 17 гадоў жанчына была прыкаваная да ложку. Усе гэтыя гады Міхась яе шчыра даглядаў: мыў бялізну, гатаваў ежу, падбадзёрваў, суцяшаў.

Ніколі не парываў Міхась крэўнай сувязі з сваякамі, сябрамі ў роднай Беларусі. Кароткімі былі ягоныя лісты, бо адчуваў, што перапіска праглядаецца. Зь вялікай асалодай чытаў беларускія газэты й часопісы, якія рэгулярна выпісваў. Вярнуцца ў родны Слонім Ракевіч змог толькі ў канцы 1980-х гадоў ужо зусім хворым чалавекам. Болей часу праводзіў у больніцы, чым дома, на Таполевай вуліцы.

Ня стала Міхася Ракевіча на пачатку сакавіка 1992 году. Знайшоў ён свой вечны спачын на могілках у вёсцы Клепачы. Праводзілі яго ў апошні шлях амаль усе жыхары вёсак Клепачы й Ваўчкі. З разьвітальнымі словамі да нябожчыка зьвярнуліся Васіль Супрун, іншыя сябры й землякі. На ягонай магіле пастаўлены сьціплы помнік, а побач гарыць агеньчык шахцёрскае лямпы.

Неяк у адзін свой прыезд зь Інты, яшчэ задоўга да сьмерці, Міхась пры сустрэчы сказаў: "Калі б мне за "Чайку" далі гады тры, я быў бы нават удзячны свайму лёсу за гэта. У лягеры я пабачыў столькі разумных, адукаваных і выхаваных людзей, якіх на волі мала сустракаў".

Так, самых таленавітых, сумленных, адданых Беларусі грамадзян камуністычная сістэма старалася як мага хутчэй загнаць за калючы дрот, каб пазбавіцца ад іх. Дык давайце ж не забываць такіх людзей, а шанаваць сьветлую памяць пра іх.

*Андрэй Краўцоў*

## Змагаўся за Радзіму

*На лістапад мінулага году прыпала 80-я гадавіна з дня нараджэньня Ўладзімера Кісяля, актыўнага ўдзельніка беларускага нацыянальна-вызвольнага руху ў 1940-х гадох, вязьня сталінскіх канцлягераў.*

Уладзімер Кісель нарадзіўся 20 лістапада 1922 году ў Клецку. Пад час нямецкай акупацыі ён вучыўся ў Нясьвіжскай настаўніцкай сэмінарыі, дзе з сябрамі стварыў нелегальны "Саюз беларускіх патрыётаў". Калі прыйшлі саветы, працаваў настаўнікам на Нясьвіжчыне, завочна скончыў педагагічнае вучылішча, паступіў у Гарадзенскі пединстытут. Адначасова Ўладзімер Кісель браў удзел у заснаваньні падпольнай патрыятычнай арганізацыі "Саюз змаганьня за незалежнасьць Беларусі", якая дзейнічала ў Нясьвіжскім, Клецкім, Стаўпецкім, Гарадзенскім ды іншых раёнах. Маладыя людзі не маглі мірыцца з камуністычнымі парадкамі ды пастанавілі змагацца за незалежнасьць сваёй краіны.

У выніку правалу частка ўдзельнікаў арганізацыі была арыштаваная. У.Кісяля чэкісты арыштавалі 25 лютага 1949 году ў Горадні. Суд над імі адбыўся ў чэрвені таго ж году ў Менску. У сваім апошнім слове Ўладзімер казаў: "За ўсё сваё жыцьцё я нікога не забіў, не абрабаваў, не аблаяў. А тое, што я люблю сваю Радзіму, дык я яе люблю ад Коласа, Купалы, Багдановіча. То й судзіце мяне за гэта, спагады не прашу". Яго засудзілі на 25 гадоў канцлягераў, зьняволеньне адбываў у Казахстане. Выйшаў Уладзімер Кісель на волю ў 1960 годзе, вярнуўся ў Горадню, працаваў настаўнікам. Памёр ён 24 жніўня 1999 году, не дачакаўшыся зьезду ветэранаў нацыянальнага руху, які прайшоў празь пяць месяцаў у яго роднай Горадні…

*Іван Радзевіч*

## Антон Неканда-Трэпка

*60 гадоў прайшло з часу, як у кастрычніку 1942 году ў Казахстане памёр вядомы заходнебеларускі дзяяч, настаўнік Віленскай беларускай гімназіі Антон Неканда-Трэпка.*

Антон Люцыян Неканда-Трэпка нарадзіўся 11 лютага 1877 году ў Менску. Маці ягоная Антаніна паходзіла з старажытнага шляхоцкага роду Неслухоўскіх і была роднай сястрою Івана Неслухоўскага (паэта Янкі Лучыны). Менавіта праз знаёмства зь Янкам Лучынам зацікавіўся Антон беларушчынай. Ён вучыўся ў Беларусі, Расеі, Бэльгіі. Меў адукацыю інжынера-тэхноляга, інжынера-электрыка. У 1919 годзе вучыўся ў менскім Беларускім пэдагагічным інстытуце, быў арыштаваны бальшавікамі, але праз год здолеў патрапіць у Польшчу.

У Вільні Антон Неканда-Трэпка засяродзіўся найперш на беларускай культурніцкай дзейнасьці: супрацоўнічаў зь Беларускім музеем імя Івана Луцкевіча, працаваў у Таварыстве беларускае школы, настаўнічаў і быў дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі, выдаваў свае кніжкі па фізыцы й касмалёгіі. Працаваў ён таксама і ў дзяржаўнай тэхнічнай школе ў Вільні.

У кастрычніку 1939 году Неканда-Трэпка быў арыштаваны НКВД і атрымаў 10 гадоў прымусовых работ. Працаваў ён каля Томску ў гарадку Яя, галадаў, бо ня

мог выканаць "нормы"… У 1941 годзе, пасьля амністыі для грамадзянаў Польшчы, Антона Неканда-Трэпку вызвалілі. Ён зьвязаўся з малодшым братам Уладзіславам, якога бальшавікі таксама вывезьлі зь Беларусі. Разам яны паехалі ў Сярэднюю Азію, дзе ўжо фармавалася польская армія. У мясцовасьці Чорная Рэчка ў Казахстане А.Неканда-Трэпка затрымаўся. У кастрычніку 1942 году яго ня стала. М. Швэдзюк піша, што ён памёр "ад духоўных і фізічных перажываньняў, ад ранаў на нагах". Антон Люцыян Неканда-Трэпка, як і тысячы іншых беларускіх патрыётаў, загінуў на чужыне, так і не дачакаўшыся спатканьня з Бацькаўшчынай…

## РЭЦЭНЗІІ

### Лёс аднаго пакаленьня

**Дземідовіч Н.** Век так ня будзе. — Менск: Архіў Найноўшай Гісторыі, 2002. — 176 с.

Надзея Дземідовіч — з таго пакаленьня беларускай моладзі, сталеньне й нацыянальнае ўсьведамленьне якога прыпалі на ваеннае ліхалецьце. У многіх зь іх быў падобны лёс: незаможная сялянская сям'я, што зь цяжкасьцю магла забясьпечыць ім адукацыю, да якой было вялікае імкненьне, досьвед некалькіх акупацый, удзел у Саюзе беларускай моладзі (СБМ), рэпрэсіі савецкай улады, канцлягер у Расеі, паламаны лёс, жыцьцё з кляймом "ворагу народу".

Кніга ўспамінаў Надзеі Дземідовіч адкрывае маловядомыя старонкі жыцьця Заходняй Беларусі ў першыя пасьляваенныя гады. Тысячы людзей знаходзіліся тады на нелегальным становішчы, з розных прычын баючыся рэпрэсій савецкіх уладаў. Сярод іх была й Надзея Дземідовіч, маладая паэтка, былая актывістка слонімскага Саюзу беларускай моладзі. Пад час масавых арыштаў дзяржбясьпекай сяброў СБМ у Слоніме, якія адбыліся 13 сьнежня 1944 году, Дземідовіч выпадкова засталася на волі. Сваякі парадзілі хавацца. Доўгіх пяць гадоў Надзея Дземідовіч была на нелегальным становішчы, а пасьля жыла пад чужым імем. Яе знайшлі ў 1949 годзе ў Казахстане. Жудасна катавалі, судзілі, адправілі ў канцлягер. "Ня плач, Надзейка, век так ня будзе!" — сказала ёй маці пасьля суду на разьвітаньне. І яна верыла, што яе пакуты ня вечныя. Шкадавала толькі страчаных пяці гадоў жыцьця. Шкадавала, што хавалася тады, як сябры стваралі моладзевае патрыятычнае падпольле ў Слоніме.

Дземідовіч падрабязна піша пра Кенгірскае паўстаньне палітвязьняў 1954 году, жорстка задушанае ўнутранымі войскамі, згадвае суайчыньніц, якія разам зь ёю арганізавалі ў канцлягеры беларускую групу, шмат увагі аддае сваёй сям'і. У кнізе зьмешчаныя таксама вершы Надзеі Дземідовіч, фотаздымкі з сямейнага архіву.

Кніга "Век так ня будзе" яскрава дэманструе, як расправўляліся акупанты зь любымі праявамі нацыянальнай сьведамасьці, беларускага патрыятызму сярод моладзі. Караючы юнакоў і юначак — будучую нацыянальную інтэлігенцыю, яны спадзяваліся падсекчы карані вызвольнага руху. Але, як птушка Фенікс, адраджаюцца ў народзе незалежніцкія ідэі, выходзяць зь яго новыя, маладыя нацыянальныя сілы, якія працягваюць барацьбу за вольную й незалежную Беларусь.

Аўтарка прыгадвае такі выпадак. У першы навучальны год па прыходзе саветаў (у 1944 годзе) дзяўчынка з Альбертыну спыталася ў сваёй настаўніцы беларускай мовы, чаму не сьвяткуецца дзень 25 сакавіка. Тая знайшлася: "Такога сьвята ніколі не было. Гэта вам фашысты галаву затуманілі"…

Насуперак усім цяжкасьцям і перашкодам Надзея Дземідовіч захавала сваю любоў да Бацькаўшчыны, свой патрыятызм. Яна вылучаецца актыўнай грамадзянскай пазыцыяй: нягледзячы на інваліднасьць, удзельнічае ці не ва ўсіх акцыях нацыянальных сілаў, выступае перад моладдзю. А яшчэ яна піша ўспаміны пра беларускіх патрыётаў — шмат каго зь іх ужо няма сярод жывых. Таму можна спадзявацца новай кнігі спадарыні Надзеі.

*С.Ё.*

## У Красным пахаваны апошні ўдзельнік паўстаньня

На могілках мястэчка Краснае, што па дарозе з Менску на Маладзечна, захавалася магіла Ігната Абрамовіча. На надмагільным помніку пазначана, што ён нарадзіўся ў 1839 годзе, а памёр у студзені 1944 году, і што ён — ветэран паўстаньня 1863 году. Значыць, пражыў 105 гадоў! І гэта пасьля паўстаньня, пасьля магчымай катаргі, рэвалюцыі і дзвюх сусьветных войнаў.

Старэйшыя красненцы, знаёмцы і суседзі Ігната Абрамовіча сыйшлі ў нябыт. Маладзейшыя ж, у тым ліку і аўтар гэтай нататкі, амаль нічога не ведалі пра гэтага сьціплага чалавека.

Захаваўся дом, у якім паўстанец жыў апошнія гады. Шукаем родзічаў у Беларусі, Польшчы і Расеі. Магіла Ігната Абрамовіча сёньня абноўленая і дагледжаная, і да яе можна прыйсьці, як і да магілы каліноўцаў у суседняй Плябані, каб ушанаваць памяць нашых продкаў, што жылі і змагаліся за будучыню Краіны.

*Аляксандр Харытон,*
*Краснае, Маладзечанскі раён*